Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
23 КРАСАВІКА 2016 г. СУБОТА № 76 (28186) Кошт 2400 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Дзень у «шкуры»... студэнта
СТАР. 8



## Размова пра кніжную графіку
СТАР. 12



## Як іх перавыхаваць?
СТАР. 15

# Пяць нагодаў для радасці



Фота БЕЛТА.

Гамяльчанка Алена КУЗЮКІНА — аднагодка чарнобыльскай катастрофы — з'явілася на свет у маі 1986 года. А 26 красавіка 2006-га стала мамай — нарадзіла першую дачушку Ангеліну. Сёння ў сям'і Кузюкіных цэлых пяць нагодаў для радасці: Алена разам з мужам Юрыем выхоўваюць пяцярых дзяцей. Своеасаблівым падарункам на 30-годдзе для маладой мамы стаў ордэн Маці. Заслужаную ўзнагароду Алена атрымала напярэдадні 30-годдзя катастрофы на ЧАЭС.

■ Нацыянальны каларыт

## ІЗУМРУДНАЕ БАГАЦЦЕ КРАІНЫ
### ЯК ПАСТАВІЦЬ ЭКАТУРЫЗМ НА КАМЕРЦЫЙНЫЯ РЭЙКІ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Беларусь валодае каласальнымі прыроднымі багаццямі. За чысціню рэк і азёр яе называюць «сінявокай». Унікальная экасістэма балот нашай краіны дазваляе ёй быць «лёгкімі» ўсёй Еўропы. Непаўторнасць маляўнічых беларускіх краявідаў здольная здзівіць нават самага пераборлівага турыста. Разам з тым кірунак экалагічнага турызму, на думку спецыялістаў, у краіне развіваецца надта павольна. У тым, чаму справы ў гэтай сферы ідуць менавіта так, разбіраўся карэспандэнт «Звязды».**

СТАР. 10

■ Свая справа

## У 80 ГАДОЎ... НА КАНЯ!

**У былым ваенным гарадку каля Наваполацка сям'я стварыла конны клуб. Гаспадар «коннага царства», дарэчы, служыў у той самай вайсковай часці, на тэрыторыі якой цяпер утрымлівае коней. Але самае цікавае — у яго клубе займаюцца коннікі ва ўзросце за 80!**

### КАМУ МУЖ КУПІЦЬ... БРЫЛЬЯНТЫ

У пасёлак Баравуха-1, дзе месціцца конны клуб «Баярд», мы прыехалі пад вечар. Гэта была далёка не першая журналісцкая сустрэча ў той дзень, і мы вельмі стаміліся. Аднак Ігар і Вольга Аўяр'янавы хутка зарадзілі станоўчай энергетыкай. Ёсць такія людзі, якія з першага знаёмства становяцца блізкімі. Гэта пра іх. Ігар служыў у паветрана-дэсантных войсках, ваяваў у Афганістане. За гераізм узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Але пра гэта мы даведаліся пазней. Спачатку гаспадары павялі нас да коней.



**У сядле бабулі адчуваюць сябе ўпэўнена.**

— У мяне дзед быў графскім конюхам ва Украіне. У Ігара дзед — казацкі атаман. Бабуля — карэнная казачка. Напэўна, любоў да гэтых жывёл у нашых генах, — смяецца Вольга.

Клубу «Баярд» сёлета 10 гадоў. Коней тут восем. І ўсе не «са спорту», а набытыя на конезаводах або ў гаспадароў. Сярод жывёл ёсць і «імянная». Яна належыць не клубу, а жанчыне з горада. Дама купіла кабылу і аддала ў «Баярд» на пастой.

— Пачыналася ўсё, як у казцы пра Папялушку, з карэты. Яшчэ жывёл не было, а «колы» купілі: каб катаць маладажонаў, аматараў рамантыкі, — распавядае Вольга.

СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЗАБАРОЎСКІ, першы намеснік міністра эканомікі:**

*«Як і нашы калегі з Расіі, мы робім першыя крокі па трохгадовым планаванні бюджэту, калі будзем бачыць прагноз не толькі 2017 года, але і 2018 і 2019 гадоў. Такім чынам, будзе магчымасць фарміраваць бюджэтныя праграмы так, каб кожны бюджэтны рубель, кожная капейка, якія праходзяць праз праграму, мелі б зваротную сувязь, каб мы бачылі, як выконваюцца тыя ключавыя паказчыкі эфектыўнасці, якія мы там устанавілі. Важна разумець, што неабходна не толькі ўкладваць грошы, але і ацэньваць эфектыўнасць іх укладвання, больш якасна праводзіць бюджэтную палітыку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19687,00 | ▲ |
| Еўра | 22210,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 297,71 | ▼ |
| Укр. грыўня | 776,76 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ На думку парламентарыя

# ПАСЛЯ РЭАБІЛІТАЦЫІ

## Верхняя палата плануе перагледзець «чарнобыльскія» законы

**У Савеце Рэспублікі ўдзяляюць значную ўвагу пытанням мінімізацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. У прыватнасці, прапануюцца правесці маніторынг законаў, звязаных з гэтай сферай. Размова пра гэта адбылася падчас выязнога пасяджэння Прэзідыума верхняй палаты беларускага парламента. Больш падрабязна пра маніторынг расказала «Звяздзе» Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.**

Па яе словах, за тры дзесяцігоддзі пасля катастрофы сфарміравалася адпаведная нарматыўная база, якая ахоплівае грамадскія адносіны і ўсе кірункі дзейнасці дзяржаўных органаў па пераадоленні наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. У 1991 годзе былі прыняты законы «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія трапілі пад радыеактыўнае забруджанне ў выніку катастрофы на ЧАЭС». Яны былі актуалізаваны ў апошнія гады, але і цяпер законы патрабуюць зменаў. З моманту катастрофы на ЧАЭС было выканана пяць адпаведных дзяржаўных праграм. Праз тры дзесяцігоддзі пасля аварыі іх галоўнай мэтай стаў пераход ад рэабілітацыі тэрыторый да развіцця і стварэння спрыяльных умоў для жыцця насельніцтва. «Менавіта пад гэта і трэба адаптаваць ужо існуючае заканадаўства», — лічыць Святлана Герасімовіч.

— Безумоўна, парламентарыі павінны прапаноўваць, якія змены варта ўносіць у заканадаўства аб наступствах аварыі на Чарнобыльскай АЭС, — расказала карэспандэнту «Звязды» сенатар. — Але для гэтага нам перш за ўсё трэба пачуць меркаванні спецыялістаў, якія штодзённа сутыкаюцца з тым, што прапісана ў законе. Таму падчас маніторынгу мы будзем шчыльна супрацоўнічаць у сферах, якія тычацца пытанняў пераадолення наступстваў катастрофы на ЧАЭС, як з прафесіяналамі, з мясцовымі органамі ўлады, так і з шырокім колам грамадскасці.

На думку парламентарыя, змены, якія тычацца памяншэння льгот для тых, хто нарадзіўся, жыве на забруджаных тэрыторыях, уводзіць не варта. «Я лічу, што гэта жыхары заслугоўваюць годнай дзяржаўнай падтрымкі. Час ідзе, але здароўя разам з гадамі гэтым людзям не дадаецца, — лічыць Святлана Герасімовіч. — Наадварот, мы прапаноўваем мясцовым органам улады больш уважліва ставіцца да выбаршчыкаў, праяўляць ініцыятыву і шукаць новыя крыніцы для гэтага». Напрыклад, імі могуць стаць праграмы сумеснай дзейнасці у межах Саюзнай дзяржавы ў сферы радыяцыйнай бяспекі, а таксама праекты міжнароднага тэхнічнага супрацоўніцтва, якія каардынуе ПРААН. Актыўны ўдзел у рэалізацыі такіх праектаў прымаюць і мясцовыя Саветы дэпутатаў. Для ўдзелу ў конкурсах мясцовых ініцыятыў ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь» было дапушчана 594 заяўкі ад Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей. Сэнс праекта — увасобіць у жыццё сацыяльныя, эканамічныя і экалагічныя ініцыятывы, накіраваныя на развіццё тэрыторый.

Час праходзіць, але наступствы ад мінулай катастрофы дагэтуль могуць адбівацца на жыхарах забруджаных тэрыторый. Тлумачальную працу спыняць нельга. Таму ў рамках адзіных дзён інфармавання, правядзення сходаў грамадзян па месцы жыхарства і сустрэч у працоўных калектывах неабходна актыўна весці інфармацыйную работу з насельніцтвам па пытаннях рэабілітацыі і ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

— Агучваць людзям вядомыя ісціны варта хоць бы для таго, каб іх не забывалі. Бо ў нашых руках здароўе нашых дзяцей і будучыня краіны», — упэўнена Святлана Міхайлаўна.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Пляцоўка для дыялогу

# РАЗАМ ЗАСВОІЦЬ УРОК ГІСТОРЫІ

**У снежні мінулага года быў створаны міжнародны грамадскі рух «Мінская ініцыятыва», мэтай якога стала наладжванне дыялогу паміж прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі Беларусі, Расіі і Украіны. Днямі ў беларускую сталіцу з'ехаліся шматлікія навукоўцы, сацыёлагі, палітолагі, журналісты і дзеячы мастацтва трох краін. Нагода — канферэнцыя «Чарнобыль: пераадоленне», падчас якой удзельнікі абмеркавалі праблемы і задачы, што стаяць перад пацярпелымі ад самай страшнай тэхнагеннай катастрофы мінулага стагоддзя народамі. Арганізатарамі сустрэчы выступілі Міністэрства інфармацыі, Нацыянальная акадэмія навук, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД.**

— Галоўнае, пра што мы павінны думаць цяпер — гэта бяспека, — зазначыў перад адкрыццём канферэнцыі **старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ.** — Перад намі не павінна стаяць пытанне "як запусціць АЭС?", а, хутчэй, "як у надзвычайным выпадку яе спыніць?" Атамная станцыя — выгадная справа, і нам ад гэтага нікуды не дзецца, але трэба падумаць пра шматузроўневую сістэму яе бяспекі. Што дзеля гэтага могуць зрабіць удзельнікі сённяшняй канферэнцыі? Унёсак інтэлігенцыі ў справу пераадолення наступстваў Чарнобыля велізарны. Яны дапамагаюць людзям перанесці страты, выкліканыя той аварыяй: хваробы, смерць блізкіх, адсяленне. Гэта, я лічу, вельмі важна.

Канферэнцыя праходзіла на некалькіх пляцоўках. Так, напрыклад, на базе Нацыянальнай акадэміі навук адбыўся круглы стол «Чарнобыль: сацыяльны аспект», падчас якога прагучаў шэраг цікавых ідэй і ініцыятыў. У прыватнасці, гаварылася, напрыклад, пра неабходнасць стварэння беларускага нацыянальнага музея чарнобыльскай трагедыі. Паралельна працаваў круглы стол «Мірны атам», удзельнікі якога абмяркоўвалі праблемы эксплуатацыі сучасных АЭС. Асобная пляцоўка была выдзелена для пісьменнікаў — у Доме літаратара адбывался аналагічнае мерапрыемства пад назвай «Чарнобыль у літаратуры».

— За гэтыя 30 гадоў мы прайшлі доўгі шлях да разумення таго, што тады ўсё ж такі адбылося і які подзвіг здзейснілі ліквідатары і навукоўцы нашых краін, — сказаў **спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ.** —У першыя ж гады пасля катастрофы вучоныя і інтэлігенцыя пачалі асэнсоўваць яе псіхалагічны аспект. З таго часу аварыя на ЧАЭС стала ў пэўным сэнсе сімвалам, нездарма цяпер нярэдка кажуць пра «духоўны Чарнобыль», параўноўваюць з Чарнобылем нейкія трагедыі. Але, на маю думку, людзям па-ранейшаму нестае разумення таго, што сёння адбываецца з навукай і атамнай энергетыкай у прыватнасці. А таму вельмі важна, што на гэтай пляцоўцы сабраліся прадстаўнікі трох краін. Навукоўцы размаўляюць пра свой прафесійны спектр праблем, літаратары, публіцысты і палітолагі — пра сацыяльна-псіхалагічныя і сацыяльна-палітычныя наступствы Чарнобыля.

Як сцвярджаюць арганізатары, «Мінская ініцыятыва» мае намер стаць механізмам пастаяннага ўзаемадзеяння культурнай і навуковай грамадскасці Беларусі, Расіі і Украіны. На парадку дня сустрэчы значыцца абмеркаванне трохбаковых праектаў на бліжэйшыя два гады.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

# ЗНАЙСЦІ ПАРТНЁРАЎ ПА БІЗНЕСЕ

## Такую мэту паставіў Міжнародны форум дзелавых кантактаў у Брэсце

**У першы дзень мерапрыемства ў легкаатлетычным манежы экспазіцыі сваёй прадукцыі разгарнулі ўсе вядучыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці Брэстчыны. Удзельнікі выставы асаблівы акцэнт зрабілі на новыя віды прадукцыі. Напрыклад, фірма «Брэсцкае марожанае» паказала прадукты высокай тлустасці. Такія, як былі ў савецкія часы. Аказваецца, яны і цяпер карыстаюцца папулярнасцю. А Пінскі мясакамбінат праз каўбасныя і мясныя вырабы, на ўпакоўцы якіх адлюстраваны розныя гістарычныя будынкі, папулярызуе свой рэгіён. Лінейка называецца «У кожнага свая гісторыя».**

На выставе заўважаны таксама вядомыя на Брэстчыне прадпрыемствы — кобрынская фабрыка цацак «Палессе», «Граніт» з Мікашэвіч, мэблевы гігант «Пінскдрэў». Пэўную разыначку экспазіцыі прыдала каляровая шарэнга вырабаў рамеснікаў.

На афіцыйным адкрыцці выставы падкрэслівалася, што галоўная мэта форуму заключаецца ў пошуку інвестараў па бізнесе, у прыцягненні інвестыцый і стварэнні новых вытворчасцяў. Асаблівая ўвага ўдзяляецца гэтым разам малому і сярэдняму бізнесу.

У Першым міжнародным форуме дзелавых кантактаў «Брэст-2016», які адбыўся на другі дзень, прынялі ўдзел прадстаўнікі больш як 30 краін. На сустрэчы з дзелавымі людзьмі і дыпламатамі старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС падкрэсліў, што ўжо ёсць пэўныя вынікі перамоў. Дасягнуты дамоўленасці, напрыклад, са славацкай кампаніяй па будаўніцтве дрэваапрацоўчага прадпрыемства, польскія інвестары зацікавіліся пляцоўкай пад будучы лагістычны цэнтр у Жабінкаўскім раёне. Такім чынам, форум павінен паспрыяць актывізацыі супрацоўніцтва паміж краінамі і рэгіёнамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ На слыху

# АТРАКЦЫЁН З АРТЭФАКТАМІ

**У гомельскім парку на месцы, дзе планавалі ўстанавіць атракцыён, знойдзены цікавы культурны археалагічны пласт.**



Калі рабочыя капалі катлаван пад падмурак, выявіліся рэшткі старажытнага жылля. Работы прыйшлося прыпыніць, а археолагі заняліся выманнем артэфактаў.

— Тут і раней праводзіліся ахоўныя даследаванні, звязаныя з правядзеннем інжынерных камунікацый, — адзначыў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Уладзімір ЛІТВІНАЎ.** — У папярэднія гады знаходзілі пераважна кераміку, шкляныя бранзалеты, вырабы з металу, косці. Сёння мы маем прыкладна тое ж самае.

Уся тэрыторыя палацава-паркавага ансамбля — гісторыка-культурная каштоўнасць і помнік археалогіі «Гарадзішча старажытнага Гомеля». Навукоўцы сцвярджаюць, што тэрыторыя вялікага палітыка-адміністрацыйнага цэнтра з насельніцтвам да пяці тысяч чалавек дасягала 20 гектараў. І хоць, паводле летапіснай традыцыі, адлік гадоў абласны цэнтр вядзе з 1142 года, заснаваючыся на археалагічных знаходках, можна казаць, што Гомель як буйны горад існаваў з канца X стагоддзя.

Пакуль на месцы раскопак відаць два пласты: канца X — 30-40-х гадоў XIII і XVII — XVIII стагоддзяў. Археалагічнымі работамі займаюцца спецыялісты палацава-паркавага ансамбля і валанцёры-студэнты дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны. За некалькі дзён выяўлены фрагмент шклянога бранзалета XII стагоддзя і абломак амфары з візантыйскімі ўзорамі. Цікавасць уяўляе і шкляное гарматнае ядро XVII стагоддзя памерам з тэнісны мяч.

Што ж тычыцца ўводу ў эксплуатацыю новага атракцыёна «Вясёлыя горкі», магчыма, яго адкрыюць не ў жніўні, як было запланавана, а крыху пазней.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Актуальна

# Адміністратар ПРААН Хелен Кларк выступіць з дакладам па чарнобыльскай аварыі

**Візіт Хелен Кларк запланаваны на 24-25 красавіка. Госця выступіць асноўным дакладчыкам на міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 30-й гадавіне катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якая адбудзецца ў панядзелак у Палацы Рэспублікі. Таксама Хелен Кларк адкрые шэраг мерапрыемстваў, прымеркаваных да гэтай даты.**

У нядзелю ў Лошыцкім парку каля Дрэва міру і ўстойлівага развіцця будзе адкрыты памятны знак, прысвечаны 70-годдзю заканчэння Вялікай Айчыннай вайны і заснавання ААН. У цырымоніі прымуць удзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і дырэктар рэгіянальнага бюро Праграмы развіцця ААН па краінах Еўропы і СНД Джыхан Султанаглу.

У панядзелак Хелен Кларк разам з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем і старшынёй Мінгарвыканкама Андрэем Шорцам прыме ўдзел у цырымоніі адкрыцця ў сталічнай школе №130 мемарыяльнай дошкі ў гонар Рут Уолер, прадстаўніцы першай місіі ААН, якая працавала і памерла ў Беларусі.

Нагадаем, што Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў Хелен Кларк і Джыхан Султанаглу ордэнам Францыска Скарыны за значны ўнёсак у развіццё супрацоўніцтва паміж нашай краінай і ААН у правядзенні комплекснай рэабілітацыі і забеспячэнні ўстойлівага развіцця рэгіёнаў, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС.

Дарэчы, з 1998 года Праграма развіцця ААН рэалізавала ў нашай краіне каля 8 праектаў, праграм і ініцыятыў агульным бюджэтам больш за 70 мільёнаў долараў ЗША. Так, былі праведзены чатыры буйныя чарнобыльскія праекты з удзелам міжнародных і замежных донараў.

**Кацярына РАДЗЮК**

■ Будзь у курсе

# У вёску — на майскія

**Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» абвясціла графік працы прыгарадных маршрутаў на майскія святы.**

У сувязі з пераносам рабочых дзён згодна з Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №976 ад 23.11.2015 года «Аб пераносе працоўных дзён у 2016 годзе», работа прыгарадных маршрутаў запланавана па наступным графіку: 7 і 8 мая — па графіку суботы, 9 і 10 мая — па графіку нядзелі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# За сродкі ад рэспубліканскага суботніка

## пабудуюць дзіцячую бальніцу ў Гомельскай вобласці

**Сёння ў Беларусі праходзіць рэспубліканскі суботнік. Яго добраахвотныя ўдзельнікі — не толькі звычайныя жыхары краіны, а і прадстаўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Валанцёры зоймуцца прыборкай гарадскіх вуліц, дарог і паркаў, добраўпарадкаваннем месцаў дзіцячага адпачынку, помнікаў культуры і грамадска значных месцаў, паведаміла прэс-служба ўрада Беларусі.**

Грошы, заробленыя за 23 красавіка органамі дзяржкіравання, падпарадкаванымі ўраду, і іншымі юрыдычнымі асобамі, будуць накіраваны ў раённыя і гарадскія выканаўчыя камітэты, пасля чаго пералічаны на рахункі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама. Апошнія павінны будуць штодзённа пералічваць палову сродкаў, атрыманых ад суботніка, на рахунак Міністэрства фінансаў у Нацыянальным банку краіны. Нумар рахунка — 3640900000105, код банка — 153005042, атрымальнік — Міністэрства фінансаў, УНП 100691903. Грошы пойдуць на праектаванне і будаўніцтва Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы.

Другая палова сродкаў ад суботніка будзе ўжыта аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам на рэканструкцыю, рэстаўрацыю, аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцяў, месцаў баявой і воінскай славы, пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, развіццё і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы рэабілітацыйна-аздараўленчых цэнтраў для дзяцей, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, а таксама на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых і спартыўна-аздараўленчых лагераў да летняга сезону. Брэсцкі аблвыканкам, напрыклад, пералічыць сродкі на будаўніцтва ў вобласці маладзёжнага патрыятычнага цэнтра.

Грамадзяне, якія сёння працуюць на сваіх звычайных месцах, пералічаць у бюджэт пэўную суму, вызначаную калектывамі работнікаў.

Летась на рэспубліканскім суботніку было зароблена каля 66,9 млрд беларускіх рублёў.

### ДЭПУТАТЫ БУДУЮЦЬ ПАРК, А ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ — ШЧЫРУЮЦЬ КАЛЯ МКАДА

**Падчас рэспубліканскага суботніка дэпутаты Палаты прадстаўнікоў будуць працаваць на аб'ектах, што знаходзяцца ў іх выбарчых акругах. Як паведаміла прэс-служба ніжняй палаты, у сталіцы група дэпутатаў на чале са спікерам Палаты прадстаўнікоў Уладзімірам Андрэйчанкам, а таксама работнікі сакратарыята прымуць удзел у пасадцы дрэў у парку «Цівалі».**

Парк ствараецца ў Фрунзенскім раёне ў межах вуліц Прытыцкага—Глебкі—Матусевіча—Цімашэнкі.

«Пакуль гэтая велізарная, скапаная ямамі тэрыторыя знаходзіцца ў вельмі запушчаным стане, але ў будучыні тут размесціцца буйны фізкультурна-аздараўленчы комплекс: спускі для гарналыжнікаў, лыжаролерная траса, штучныя скалы для тых, хто захапляецца скалалазаннем, спартыўныя пляцоўкі для гульнявых відаў спорту, — расказалі ў прэс-службе. — Запраектаваны зоны для спакойнага адпачынку — з дарожкамі, кветнікамі, масткамі, альтанкамі. У рэльефе парку будзе захаваны прыродны ландшафт і выкарыстана натуральнае абліччa ўзгорыстай мясцовасці. З часам парк стане выдатным цэнтрам адпачынку для жыхароў раёна і сталіцы».

Як паведаміла прэс-служба Савета Рэспублікі, кіраўніцтва і члены Савета Рэспублікі падчас суботніка прымуць удзел у навядзенні парадку ўздоўж Мінскай кальцавой аўтадарогі.

Нагадаем, раней старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч і намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін даручылі Мінгарвыканкаму і Мінаблвыканкаму навесці належны парадак на тэрыторыях сядзібнай жылой забудовы і гаражных масіваў уздоўж МКАДа. Да названай даты неабходна выканаць рамонт пуцеправодаў, мастоў і падземных пераходаў, абнавіць дарожныя знакі, паказальнікі і рэкламныя шчыты. Пастаўлена задача ачысціць ад кустоў лясныя масівы на глыбіню не менш за 40 м ад краю лесапаласы і навесці парадак на сельскагаспадарчых землях каля кальцавой.

### КАБ ТОЛЬКІ ДЗЕЦІ БЫЛІ ЗДАРОВЫЯ

**Больш за 460 тысяч жыхароў Гомельшчыны прымуць удзел у рэспубліканскім суботніку, з іх 160 тысяч грамадзян — у самім Гомелі. Значная колькасць людзей будзе працаваць на сваіх рабочых месцах, ну а прадстаўнікі большасці арганізацый і ўстаноў будуць займацца добраўпарадкаваннем тэрыторый.**

Першы намеснік старшыні камітэта эканомікі аблвыканкама, член абласнога штаба па правядзенні суботніка Андрэй Канюшка адзначае, што ў планах — работы па навядзенні парадку ў загарадных дзіцячых аздараўленчых лагерах, прыгарадных лясах, на пахаваннях часоў Вялікай Айчыннай вайны. Сельскія працаўнікі будуць у гэты дзень галоўным чынам на палетках, дзе поўным ходам працягваецца сяўба.

Цімураўскія піянерскія атрады далучаюцца да працоўнай акцыі. Падлеткі накіруюцца на дапамогу састарэлым і ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Будуць аказваць дапамогу ў навядзенні парадку, а таксама займацца добраўпарадкаваннем месцаў вайсковых пахаванняў, помнікаў...

Для Гомельскай вобласці сёлетні рэспубліканскі суботнік мае асаблівае значэнне. Прынята рашэнне палову заробленых усёй краінай грашовых сродкаў накіраваць для праектавання і будаўніцтва Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы, у якой вобласць мае вялікую патрэбу. Рэалізацыю гэтага важнага для аховы здароўя рэгіёна праекта плануецца пачаць у канцы красавіка. Мяркуецца, што жыхары Гомельшчыны заробяць на рэспубліканскім суботніку каля Br10 млрд.

### УДЗЕЛЬНІЧАЮЦЬ УСЕ: АД ГУБЕРНАТАРА ДА НАВУЧЭНЦА

**На Віцебшчыне ў традыцыйным рэспубліканскім суботніку бярэ ўдзел каля паўмільёна жыхароў.**

Губернатар Мікалай Шарстнёў разам з іншымі першымі афіцыйнымі асобамі абласной улады вырашыў папрацаваць ва Ушацкім раёне на мемарыяльным комплексе «Прарыў». Там праходзіць рэканструкцыя. Падчас суботніка арганізавана праца ў месцах падыходаў да комплексу, добраўпарадкаванні... Поўнасцю прыведзены ў парадак мемарыял запланавана ўрачыста адкрыць у гонар чарговай гадавіны Вялікай Перамогі.

Гэта вельмі сімвалічнае месца памяці. Комплекс уяўляе сабой бетонную сцяну даўжынёй 11 метраў, якая раскалатая на дзве часткі. У цэнтры — бронзавая фігура партызана... Сярод іншага на тэрыторыі «Прарыву» ёсць больш за 30 мемарыяльных пліт, дзе пазначаны імёны 1450 воінаў. Яны загінулі падчас блакады партызанскай зоны і прарыву. А на верхняй пляцоўцы пахаваныя 450 партызанаў. Адзін з архітэктараў мемарыяла — лаўрэат Ленінскай прэміі Леанід Левін. Комплекс «Прарыў» лічыцца адным з самых значных твораў манументальнага мастацтва Беларусі. Ягo наведванне — абавязковая частка шматлікіх турыстычных маршрутаў.

Кіраўніцтва Віцебскага гарвыканкама падчас суботніка займаецца пасадкай дрэў, уборкай будаўнічага смецця на тэрыторыі музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Гэты ўнікальны дом па адрасе: Праўды, 5а вядомы тым, што тут працавалі Шагал і Малевіч, іншыя творцы. Сёлета пасля рэканструкцыі ў дарэвалюцыйным будынку адкрыецца ўнікальная экспазіцыя.

Супрацоўнікі адміністрацый раёнаў Віцебска, навучэнцы, студэнты і іншыя жыхары горада добраўпарадкуюць берагі ракі Віцьба, скверы, гарадскі парк адпачынку. Наводзіцца парадак і ў новых мікрараёнах.

Генеральная прыборка вядзецца і ў райцэнтрах, а таксама ў пасёлках і вёсках. Паралельна да аздараўленчага сезону рыхтуюцца летнікі для дзятвы.

**Ірына СІДАРОК.**
**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




■ Каб ведалі

# МАНТУ ПАГАЛОЎНА НЕ РОБІЦЦА

### ГЭТАЯ ІНФЕКЦЫЯ МНОГІЯ ГАДЫ БЫЛА НЕКІРУЕМАЙ — КОЛЬКАСЦЬ ЗАХВАРЭЛЫХ У КРАІНЕ ТО ЗНІЖАЛАСЯ, ТО ЗНОЎ РАСЛА...

**Максімальны ўздым туберкулёзу быў зафіксаваны ў 1998-м — 68,6 выпадка на 100 тысяч насельніцтва, што дазваляла гаварыць аб эпідэміі. Сёння гэты паказчык на ўзроўні 33 на 100 тысяч. Такое зніжэнне адбылося не само па сабе, а дзякуючы спецыяльнай стратэгіі, дзяржаўным праграмам з мэтавым фінансаваннем.**

— Спачатку для нас важна было проста спыніць эпідэмію, і мы займаліся ўдасканаленнем якасці дыягностыкі, — кажа **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра пульманалогіі і фтызіятрыі Андрэй АСТРАЎКО.** — Каб працягнуць зніжэнне захваральнасці ў наступныя дзесяцьдвaццаць гадоў, дыягностыка павінна стаць хуткай. Літаральна тры-чатыры гады таму хуткія метады дыягностыкі былі даступныя толькі на 4-м узроўні аказання меддапамогі, а дакладней у нашым цэнтры. Але цяпер яны даступныя ў любым раёне краіны — нават сельскаму жыхару. Кошт гэтых метадаў значна вышэйшы, але дзяржава гатова траціць вялікія грошы на змаганне з цяжкім сацыяльна значным захворваннем...



У Беларусі штодня ад туберкулёзу гіне адзін чалавек, штогод выяўляецца каля 3,5 тысячы новых выпадкаў. Глабальны фонд для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй вылучаў на барацьбу нашай краіне ўжо два гранты, агульная сума якіх склала 36 млн долараў. На бліжэйшыя тры гады вылучаны трэці грант — у памеры 11,8 млн. Сумы, здаецца, немалыя, аднак гэта прыкладна 5 працэнтаў ад гадавой сумы, у якую дзяржаве абыходзіцца барацьба ўсяго з адной інфекцыяй (з улікам затрат на функцыянаванне медустаноў, заробкі медперсаналу і інш.). Такім чынам, краіна стала адной з нямногіх у свеце, хто сёння мае магчымасць прымяняць найноўшыя лекі для лячэння. Сума такога лячэння на аднаго чалавека складае каля 16 тысяч долараў.

«З гэтага года дзеці будуць вакцынавацца ад туберкулёзу толькі пры нараджэнні, а рэвакцынацыю ў 7-гадовым узросце мы адмянілі, — тлумачыць Андрэй Астраўко. — А з мінулага года была адменена і пагалоўная туберкулінадыягностыка — рэакцыя Манту праводзіцца цяпер толькі ў групах рызыкі ў дзяцей ва ўзросце да 7 гадоў. У дачыненні да тых, каму ад 8 да 17 гадоў, зноў жа, у групах рызыкі, мы выкарыстоўваем іншы метад туберкулінадыягностыкі — дыяскін-тэст. Сусветная практыка і нашы даследаванні паказалі, што адмена рэвакцынацыі і новы падыход да вызначэння таго, як прайшла вакцынацыя, — больш мэтазгодныя. Дыяскінтэст, які праводзіцца з дапамогай біясінтэтычнага імуналагічнага прэпарата, рэагуе толькі на актыўны туберкулёз, і гэтага нам дастаткова. Такім чынам, мы адмовіліся ад шырокай хіміяпрафілактыкі — досыць таксічнай, якая можа нашкодзіць дзецям з захворваннямі печані. Па дасягненні 18 гадоў ужо можна праводзіць рэнтгеналагічнае даследаванне».

Вакцына БЦЖ, якая праводзіцца на 3-5 дзень жыцця нованароджанага, не папярэджвае захваральнасць на туберкулёз, яна толькі папярэджвае развіццё цяжкіх формаў, асабліва ў дзяцей першага года жыцця, калі імунітэт зусім слабы і падобнае захворванне можа абумовіць гібель у выніку, напрыклад, развіцця менінгіту з цяжкім пашкоджаннем галаўнога мозга. Дарэчы, за апошнія дзесяць гадоў у нас фіксаваліся адзінкавыя выпадкі гібелі дзяцей, хворых на туберкулёз.

Трэба разумець, што ў прыродзе нішто нікуды не знікае. Так і палачка Коха можа проста чакаць, калі чалавек аслабіць кантроль. Тым не менш перамогай над туберкулёзам Сусветная арганізацыя аховы здароўя лічыць дасягненне распаўсюджанасці менш чым 10 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва.

**Святлана БАРЫСЕНКА** ■

# У 80 ГАДОЎ... НА КАНЯ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Юныя выхаванцы клуба ўжо маюць спартыўныя дасягненні, але галоўная мэта «Баярда» — стварыць месца добрага адпачынку. Каб жыхары Наваполацка, дзе не самая добрая экалогія, набіраліся тут сіл і аздараўляліся. Да Авяр'янавых прыязджаюць сем'ямі і закаханымі парамі. Хлопцы, каб зрабіць прапанову рукі і сэрца дзяўчатам, арандуюць каня.

Вольга па адукацыі медык і адна з нямногіх у краіне прафесійна займаецца іпатэрапіяй.

— Напрамак модны, але мае і супрацьпаказанні. Напрыклад, якія катанні на конях пры раку крыві? А вось з неўрозам, неўрастэніяй, праблемамі з пазваночнікам (не з усімі), калі ласка, на каня! Іпатэрапіяй лечаць і залежнасць ад камп'ютарных гульняў. Яна «супакойвае» гіперактыўных дзяцей... Катанне — ідэальны спосаб схуднець. Да нас многа жанчын прыязджаюць з патаемнай мэтай уразіць мужа настолькі, каб ён потым купіў новую машыну і брыльянты, — жартуе суразмоўца.


Муж і жонка АВЯР'ЯНАВЫ.




Коні клуба.

Вольга Авяр'янава — дэпутат пасялковага Савета і актыўны агітатар за здаровы лад жыцця. У якасці мецэната плённа супрацоўнічае з аддзяленнем дзённага знаходжання інвалідаў.

**«На апошнім мясцовым фэсце «Краіна здароўя» з фурорам праехалася на кані 80-гадовая бабуля. Сказала, што і надалей будзе такім чынам «захоўваць сябе ў форме».**

— Шмат добрых слоў чуем ад людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Акрамя коней, у нас ёсць козы, тайскія пуховыя куры. Іх яйкі, дарэчы, вельмі карысныя. У іх складзе ёсць кампанент, які па ўздзеянні на арганізм чалавека падобны на жэньшэнь. Ёсць індыкі. Птушак дазваляем кранаць, каб адчулі іх цеплыню. Гэта таксама лечыць. Анімалатэрапія актыўна прымяняецца на Захадзе. І мы не адстаём, — працягвае Вольга.

## УДАЛЫ ДЭБЮТ У БІЗНЕСЕ

Гаспадыня «Баярда» мае статус індывідуальнага прадпрымальніка. Зарэгістраваць сваю гаспадарку як аграсядзібу не ўдалося, бо аказалася, што Баравуха-1 не лічыцца сельскай мясцовасцю.

— Да апошняга часу тут, дзе коні цяпер знаходзяцца, была прамысловая зона. Гэтыя будынкі — былыя гаражы і склады рамонтнай роты вайсковай часці. Цяпер мы ў іх трымаем жывёл і арганізуем адпачынак. Цяпер трэба замовіць дарагі праект рэканструкцыі тэрыторыі. Давядзецца патраціцца, каб нашы планы былі рэалізаваныя, — разважае Вольга.

Задумана, што людзі тут змогуць не проста пакатацца, у тым ліку і па спецыяльна распрацаваных конных маршрутах, але правесці сапраўднае свята: з гасцямі, застоллем, вогнішчам і танцамі. Можна будзе ладзіць і дзіцячыя імяніны, і ранішнікі. Фантазія наконт магчымых мерапрыемстваў, як кажуць, не мае межаў.

Выпадкова на сцяне ў гаспадарчай забудове ўбачыў дыплом, які насамрэч дарагога каштуе. Вольга Авяр'янава ў 2012 годзе стала адным з лаўрэатаў юбілейнага (5-га па ліку) рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года». Тагачасная старшыня «Беларускага саюза жанчын» Надзея Ермакова асабіста павіншавала з перамогай у намінацыі «Удалы дэбют у бізнесе».

## «КАЎБОЙКАМ» ДЗЯВЯТЫ ДЗЯСЯТАК

«Баярд» — ужо традыцыйны ўдзельнік многіх гарадскіх мерапрыемстваў. На навагодніх шэсцях ён наперадзе калоны. Дзень ведаў, свята горада, Міжнародны жаночы дзень і іншыя падзеі ў Наваполацку без удзелу клуба немагчыма ўявіць.

Па вопыт працы з цяжка хворымі людзьмі сюды прыязджаюць з-за мяжы. Нядаўна гасцямі клуба былі сацыяльныя работнікі з Расіі. Вельмі паспяхова «Баярд» супрацоўнічае з гарадскім «Інстытутам залатога ўзросту», студэнты якога — пенсіянеры.

— На апошнім мясцовым фэсце «Краіна здароўя» з фурорам праехалася на кані 80-гадовая бабуля. Юбілей адсвяткавала ў жніўні. А ў верасні стала «зоркай» у сядле. Сказала, што і надалей будзе такім чынам «захоўваць сябе ў форме». Для састарэлых іпатэрапія вельмі карысная. Напрыклад, каб лепш працаваў плечавы пояс, вочная цягліца ўмацоўвалася, — тлумачыць Вольга.

Пакуль з «Інстытута залатога ўзросту» ў «Баярд» прыходзяць толькі жанчыны. Але адзін мужчына таксама паабяцаў пачаць займацца ў клубе. Ён у свае немалыя гады штодня бегае і робіць гімнастыку. Цяпер паспрабуе сябе і ў ролі «каўбоя».

У саміх Авяр'янавых ужо ёсць маленькі ўнук. Іх сынам 32 і 29 гадоў. Адзін з іх байкер, разам з сябрамі на тэрыторыі «Баярда» арганізуе захапляльныя святы.

Вольга і Ігар здзівілі яшчэ тым, што ніводнага разу не паскардзіліся. Утрымліваць коней — справа нялёгкая. Корм, вада і святло каштуюць немалых грошай. Але яны ад свайго хобі, якое стала прафесійным заняткам, адмаўляцца не збіраюцца. Атрымліваюць асалоду ад таго, што робяць. І рады, калі наведвальнікі клуба сыходзяць дамоў з добрым настроем.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

*Пасёлак Баравуха-1—Віцебск.*

**Фота Віктара НІКАЛАЕВА і з асабістага архіва Вольгі АВЯР'ЯНАВАЙ.**


БПС-СБЕРБАНК

**С 25.04.2016** ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов по действующим договорам срочного банковского депозита «Доверяй +»:

| Валюта депозита | Размер процентов (годовых) |
|---|---|
| BYR | 23% |

| Валюта депозита | Период заключения договоров | Размер процентов (годовых) |
|---|---|---|
| USD, EUR | с 14.10.2014 по 08.07.2015 (вкл.) | от 100 до 300 000 – 3% |
| | с 29.02.2016 по 31.03.2016 (вкл.) | от 100 – 3% |

**Установленный размер процентов будет применен с 25.05.2016**, но не ранее истечения периода фиксированного размера процентов по депозиту.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк».



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ в извещение о проведении аукциона 16.05.2016 г.**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о внесении изменений в извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Дзержинский лен», назначенного на 16.05.2016 г., в отношении начальной стоимости лота № 14.**

**Считать начальную стоимость лота № 14 равной 25 080 000 (двадцать пять миллионов восемьдесят тысяч) белорусских рублей.**

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.04.2016 г.*

УНП 690324015



**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 05 мая 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Место-нахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | Административное помещение общей площадью 289,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145924 (назначение: административное помещение) 1-й этаж 4-этажного здания | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2 | 948 741 060 | 9 480 000 |
| 2. | Административное помещение общей площадью 402,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145928 (назначение: административное помещение) 3-й этаж 4-этажного здания | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6 | 1 295 089 980 | 12 950 000 |
| 3. | Административное помещение общей площадью 408,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145929 (назначение: административное помещение) 4-й этаж 4-этажного здания | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7 | 1 314 213 540 | 13 200 000 |
| 4. | «Здание котельной. Литер Б2/к-кп» общей площадью 812 кв. м, инвентарный номер 500/С-23855 (назначение: здание неустановленного назначения) | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 | 2 279 422 800 | 22 800 000 |
| 5. | «Склад (лит. Е 1/к)» общей площадью 349 кв. м, инвентарный номер 500/С-30523 (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | | 1 778 935 200 | 17 800 000 |
| 6. | «Д 1/к-кп Заготовительный участок» общей площадью 362 кв. м, инвентарный номер 500/С-30547 (назначение: здание специализированное иного назначения) | | 1 485 903 600 | 14 900 000 |

**Продавец имущества:** ОАО «Реммех», ул. Бабушкина, 48, 220024, г. Минск.

**Организатор торгов:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенных предметов торгов №№ 4, 5 с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в срок до 31.12.2016 в размере 100 процентов стоимости купленного имущества.

Оплата стоимости приобретенных предметов торгов №№ 1, 2, 3, 6 с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 15 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи в размере 100 процентов стоимости купленного имущества. Допускается прекращение обязательств неденежной формой расчета.

Торги проводятся **05 мая 2016 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 25.04.2016 по 02.05.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону: (029) 663-51-16.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017)296-35-94, (029) 663-51-16 (ОАО «Реммех»).**



ПЕРЕГОВОРЫ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

**УП «Проектный институт Белгипрозем» приглашает вас принять участие в переговорах по выбору подрядной организации**

**ДЛЯ РАЗРАБОТКИ ПРОЕКТА НА ЗАМЕНУ ВОДОМЕРНОГО УЗЛА.**

Предмет закупки – разработка проектно-сметной документации по замене водомерного узла (ввод в здание – ДУ-50, обводная задвижка – ДУ-50, счетчик – ДУ-20). Объект расположен по адресу: ул. Казинца, 86, Б/1.

Срок выполнения работ – май 2016 г.
Время проведения переговоров 3 мая 2016 года в 11.00.
Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: 207 05 33, тел./факс 212 07 00.

УНП 100035563



**Открытое акционерное общество**
**«Дорожно-строительный трест № 3»**
**сообщает, что в повестку дня общего собрания акционеров, намеченного на 29 апреля 2016 года, включен дополнительно вопрос:**

**2. О получении банковских гарантий ОАО «ДСТ № 3».**

**Собрание состоится в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

УНП 700049607



В **суд Волковысского района** поступило заявление об объявлении умершим КЛЕВЦОВА Юрия Анатольевича, 12 мая 1975 года рождения, уроженца г. Волковыска Гродненской области, последнее известное место жительства которого: Гродненская область, г. Волковыск, ул. Боричевского, 30/37, который в апреле 2004 года выехал в г. Чехов Российской Федерации и до настоящего времени его место нахождения не известно, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Клевцове Юрии Анатольевиче, сообщить их суду Волковысского района в течение двух месяцев с момента публикации.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда»
і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 4 (55)



■ Прызыўная пара

# НА СЛУЖБУ — КРОКАМ МАРШ!

## Асноўная частка адтэрміновак традыцыйна даецца па стане здароўя. У большасці прызыўнікоў — сардэчна-сасудзістыя захворванні

**Прызыўная кампанія ў самым разгары. Неўзабаве ў армію прыйдуць маладыя і мужныя хлопцы, якія пад кіраўніцтвам вопытных афіцэраў будуць спасцігаць ваенную навуку. Заўтрашнія вайскоўцы ўжо прайшлі медыцынскія камісіі. Некаторыя нават ведаюць, дзе правядуць наступныя год—паўтара. Іншыя ж пакуль сустракаюцца з прадстаўнікамі воінскіх часцей, якія прыязджаюць па сваіх салдатаў у ваенкаматы.**



У ваенным камісарыяце Мінскай вобласці адбор прызыўнікоў ужо амаль завяршыўся. Гэтай вясной у армію адправіцца каля 1300 жыхароў Міншчыны. Які салдат прыйдзе ў войска, па якіх прычынах прадастаўлены адтэрміноўкі і ўвогуле пра асаблівасці гэтай прызыўной кампаніі расказаў **ваенны камісар Мінскай вобласці палкоўнік Мікалай КРЫЎЧЭНЯ**.

***— Мікалай Сцяпанавіч, ужо можна скласці сацыяльны партрэт прызыўніка вясны-2016?***

— Як правіла, гэта юнак 19—20 гадоў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Тыя маладыя людзі, якія маюць вышэйшую адукацыю, прыцягваюцца да мерапрыемстваў прызыву ў асноўным восенню. Сярод прызыўнікоў мала жанатых людзей. Сямейных мы, як правіла, адпраўляем на службу ў рэзерве. Увогуле, многім з іх уласціва жаданне служыць. Ухілісты практычна адсутнічаюць. Магчыма, прычына і ў тым, што ўладкавацца на працу без вопыту службы ў арміі сёння з'яўляецца праблемай. Прынамсі, заўтрашніх прызыўнікоў бяруць неахвотна: чакай потым, пакуль ён прыйдзе. А па законе для супрацоўнікаў, якія служаць у войску, працадаўцы павінны трымаць месца. Варта сказаць, што ў гэтым прызыве ў нас менш за ўсё навабранцаў: адчуваецца дэмаграфічны спад 1990-х. Увосень іх стане больш. Колькасць прызыўнікоў паступова будзе павялічвацца.

***— Асноўная частка адтэрміновак па традыцыі даецца па стане здароўя. Мяркую, што і гэтая прызыўная пара не стане выключэннем. Калі так, то на што, часцей за ўсё, скардзяцца прызыўнікі?***

— Сёлета ў нас высокі працэнт прыдатнасці да воінскай службы. Сёння 43% прызыўнікоў могуць служыць у арміі па стане здароўя. Гэта добры паказчык. Тых, хто па здароўі непрыдатны да вайсковай службы, у гэтым прызыве па Мінскай вобласці каля 800 чалавек. Большасць з іх мае сардэчна-сасудзістыя захворванні. Паколькі маладыя людзі скардзяцца на паніжаны або павышаны ціск, амаль кожнаму прызыўніку на працягу сутак правяраем работу сэрца з дапамогай метаду Холтэра. Сардэчна-сасудзістыя захворванні ў такім узросце звязаны найперш з тым, што моладзь вядзе маларухомы лад жыцця, большасць часу праводзіць за камп'ютарам.

***— Каторы год вясной юнакі прызываюцца ў тым ліку на службу ў рэзерве. З чым гэта звязана і колькі жыхароў Міншчыны папоўніць рады рэзервістаў?***

— Трэба сказаць, што на постсавецкай прасторы больш нідзе няма службы ў рэзерве. Тое, што яна ёсць у нас, — добрая практыка. Служба ў рэзерве прадугледжвае набыццё грамадзянінам ваенна-ўліковай спецыяльнасці. Па дасягненні 50 гадоў салдаты і сяржанты здымаюцца з ваеннага ўліку, таму рэзерв неабходна ўвесь час папаўняць. І каб гэты працэс адбываўся больш імкліва, прызыў на гэты від службы адбываецца як восенню, так і вясной. У маі з Мінскай вобласці ў рэзерв будзе адпраўлена каля 150 чалавек. Тыя з іх, хто мае вышэйшую адукацыю, будуць служыць два гады, хто сярэднюю спецыяльную — тры.

***— Ці ідзяце насустрач прызыўніку, калі ён хоча служыць у канкрэтнай воінскай часці?***

— Усё залежыць ад стану яго здароўя. Улічваюцца і маральна-дзелавыя якасці прызыўніка.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

■ Творчыя матывы

# КАХАННЕ. АДЗІНАЕ ВАЖНАЕ

## На сцэне Драматычнага тэатра Беларускай арміі — працяг «Рамэа і Джульеты» Шэкспіра

**Ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, што было б у славутай шэкспіраўскай трагедыі пасля таго, як яе галоўныя героі — Рамэа і Джульета — загінулі? Ці прымірыла агульнае гора Мантэкі і Капулеці? А можа, наадварот, варожасць паміж двума родамі толькі ўзмацнілася б?**




Свой варыянт працягу сусветнай класікі яшчэ больш як 20 гадоў таму прапанаваў расійскі драматург і сцэнарыст Рыгор Горын. Што адбылося ў італьянскім горадзе Верона пасля трагічнай гібелі Рамэа і Джульеты, цяпер можна ўбачыць і на сцэне Драматычнага тэатра Беларускай арміі. Трагікамедыя ў двух дзеяннях «Чума на абодва вашы дамы» па матывах твора Шэкспіра ўжо каторы раз збірае поўную залу.

### НОВЫЯ ГЕРОІ — СТАРАЯ ПРАБЛЕМА

Амаль на дзве гадзіны глядач трапляе ў сярэднявечную Верону. Мантэкі і Капулеці па-ранейшаму варагуюць. Прымірыць дзве сям'і ўзяўся герцаг Вероны. Знайшоўся адзіны правільны выхад: парадніць два кланы. У якасці жаніха Мантэкі прапанавалі Антоніа з Неапаля — далёкага сваяка, ды яшчэ добрага гуляку, ім было не шкада. У якасці нявесты Капулеці выбралі сваю цяжарную пляменніцу Разаліну. Агульная нянавісць да сваякоў і пасаг, на які не паскупіліся Капулеці, зблізілі маладую пару і нават выклікалі ўзаемную сімпатыю. Але, як і ў творы Шэкспіра, саюзу галоўных герояў не наканавана было адбыцца...

— Любая п'еса — нагода для размовы, — лічыць **рэжысёр-пастаноўшчык спектакля Вячаслаў ПАЎЛЮЦЬ**. — Твор больш сучасны, чым трагедыя Шэкспіра. Горын нам зноў паказвае на праблему: героі таксама гінуць ад таго, што дзве сям'і не могуць знайсці агульнай мовы. Як той казаў, гарбатага хіба магіла выпрастае. Можа быць, спрэчкі паміж імі скончацца толькі тады, калі яны адзін аднаго пазабіваюць?

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

■ Вучэбная рота

# У АРМІЮ — ПА ПРАФЕСІЮ

## Вайсковая спецыяльнасць цэніцца і пасля службы

**Часам бывае так: прызваўшыся на тэрміновую ваенную службу, некаторыя прызыўнікі не змаглі паступіць у прэстыжную вышэйшую навучальную ўстанову або набыць хаця б сярэднюю спецыяльную адукацыю. Аказваецца, добрую прафесію, якая можа спатрэбіцца ў цывільным жыцці, можна атрымаць і ў салдацкіх пагонах. Напрыклад, у 72-м гвардзейскім аб'яднаным навучальным цэнтры, што ў Барысаве.**

Штогод у шасці школах «вучэбкі» рыхтуюць каля пяці тысяч курсантаў па ста ваенна-ўліковых спецыяльнасцях. У складзе 320-й школы ёсць адзіная ў сваім родзе вучэбная рота, дзе рыхтуюць машыністаў аўтамабільных кранаў і стропальшчыкаў практычна для ўсіх родаў войскаў Беларускай арміі. Нягледзячы на тое, што кожны з воінаў, накіраваны на вучобу з войскаў, ужо мае на руках пасведчанне кіроўцы катэгорыі «С», вучыцца тут даводзіцца практычна з чыстага ліста. Магутныя аўтакраны з электра- або гідрапрывадам складанейшыя за любы грузавы аўтамабіль, і з наскоку іх не асвоіць. Адолець праграму навучання курсантам дапамагае добрая вучэбна-матэрыяльная база, якая пастаянна абнаўляецца.

Як адзначыў **начальнік цыкла падрыхтоўкі спецыялістаў інжынерных войскаў капітан Віктар МАКАРАЎ**, курсанты з вялікім жаданнем і зацятасцю авалодваюць тонкасцямі сваёй будучай ваенна-ўліковай спецыяльнасці. А дзе яшчэ, скажыце, сёння можна за тры месяцы навучання атрымаць на рукі адразу дзве жаданыя «корачкі»?! Пасля паспяховай здачы экзаменаў кожны выпускнік атрымлівае два пасведчанні ўстаноўленага агульнарэспубліканскага ўзору на права працы ў якасці стропальшчыка 3-га разраду і машыніста аўтакрана 4-га разраду.



**Выкладчык цыкла 320-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў, лейтэнант Аляксей КАРОЛЬ і радавы Арцём КЛЮЕЎ на практычным занятку па кіраванні аўтакранам.**

Сярод курсантаў 320-й школы асаблівай павагай карыстаюцца і многія іншыя ваенныя спецыяльнасці. Напрыклад, для злучэнняў і вайсковых часцей тут рыхтуюць спецыялістаў сілавых і асвятляльных электрастанцый. Па словах **выкладчыка цыкла старшага лейтэнанта Ільі БАНДАРЧЫКА**, пасля паспяховага заканчэння «вучэбкі» падрыхтаваныя электрыкі-дызелісты атрымліваюць другую, а ў войсках і трэцюю групу допуску па бяспецы. Гэта дазваляе ім самастойна працаваць на электрастанцыях, прызначаных для сілкавання розных спажыўцоў пераменным трохфазным токам да 500 вольт або магутнасцю да 100 кілават.

Рыхтуюць у 72-м гвардзейскім аб'яднаным навучальным цэнтры і армейскіх майстроў кухарскага мастацтва. Створана адпаведная вучэбна-матэрыяльная база з навучальнымі класамі і сучаснай лабараторыяй па практычным гатаванні ежы. Спачатку курсанты штудзіруюць у навучальных класах тэорыю па асновах таваразнаўства харчовых прадуктаў, гігіене харчавання, фізіялогіі, тэхналогіі гатавання ежы. Немагчыма стаць добрым кухарам, не засвоіўшы асноўныя спосабы цеплавой апрацоўкі прадуктаў, парадак іх закладкі ў стацыянарных і палявых умовах, тэхналогію прыгатавання гарніраў і страў.

Перш чым навучыцца гатаваць для ўсіх, спачатку будучыя майстры кухарскай справы самастойна гатуюць абед для сябе. Ужо пасля двухтыднёвай вучобы пачаткоўцаў здымаюць з катлавога забеспячэння, забяспечваюць іх нормай паўфабрыкатаў, з якіх і гатуецца паўнавартасны абед. Зрэшты, побач з навучэнцамі заўсёды знаходзяцца вопытныя майстры кухарскай справы.

Запатрабаваны на рынку працы і выпускнікі 59-й школы падрыхтоўкі спецыялістаў па эксплуатацыі аўтамабільнай тэхнікі і рамонтных падраздзяленняў. Штогод адсюль выпускаецца каля 800 падрыхтаваных вадзіцеляў БТР, акумулятарнікаў, рамонтнікаў колавых і гусенічных машын, майстроў па рамонце электраабсталявання... Курсантаў рыхтуюць па 16 спецыяльнасцях.

Праходзячы ў навучальным цэнтры дадатковую дападрыхтоўку, маладыя хлопцы не толькі атрымліваюць добрую практыку па эксплуатацыі габарытных шматвосевых машын, але і маюць магчымасць дадаткова набыць (за кошт ваеннага ведамства) катэгорыю «Е» з правам кіравання вялікагрузнымі аўтамабілямі з прычэпам (паўпрычэпам). Пасля службы яны — гатовыя «дальнабойнікі», вадзіцелі шматвосевых колавых цягачоў.

У народнай гаспадарцы таксама каштоўны армейскі досвед механікаў-вадзіцеляў баявых машын пяхоты, танкаў і іншай гусенічнай тэхнікі. Сёння, напрыклад, у лясных гаспадарках, геалагічных экспедыцыях ёсць нямала лесапажарных і спецыяльных машын, якія створаны на базе тых жа БМП. Кіраваць такой тэхнікай давяраюць ваеннаслужачым запасу, якія ў свой час скончылі вайсковую «вучэбку».

**Мікалай МАКАРЭВІЧ. Фота аўтара.**

■ Векапомнае

# ВЕЧНАЯ ЗІНА

**Сем дзесяцігоддзяў мінула з часоў Вялікай Айчыннай вайны — жудаснай, крывавай, развязанай нямецка-фашысцкімі агрэсарамі супраць мірных савецкіх людзей. Жыццё пад прыгнётам ва ўмовах жорсткага акупацыйнага рэжыму на роднай зямлі стала немагчымым для тых, хто любіў Радзіму і быў гатовы аддаць жыццё за яе свабоду. Сярод іх — і юная піянерка Зіна Партнова, якая прыехала на канікулы разам з малодшай сястрычкай з Ленінграда да бабулі ў вёску Зуі Сіроцінскага раёна Віцебскай вобласці перад самым пачаткам вайны.**



Галіна ПАРТНОВА-МЕЛЬНІКАВА ў музеі сваёй сястры-гераіні.

Яна толькі скончыла сем класаў і хацела вучыцца далей. Але фашысты перакрэслілі планы. І як толькі Зіна даведалася, што недзе побач дзейнічаюць патрыёты, адразу ж пачала іх шукаць. Моладзь з вёсак Ушалы, Ферма, Зуі, Масцішча і чыгуначнай станцыі Обаль аб'ядналіся ў падпольную арганізацыю «Юныя мсціўцы», якой кіравала камсамолка Ефрасіння Зянькова. Усе яе члены былі залічаны ў партызанскі атрад імя Варашылава брыгады імя Леніна. Зіна стала актыўнай удзельніцай барацьбы з ворагам. У больш спрактыкаваных падпольшчыкаў яна навучылася канспірацыі, трапна страляць, кідаць гранаты. Дзяўчынка распаўсюджвала лістоўкі, была сувязной, разведчыцай, дыверсанткай. Фашысты збіліся з ног, спрабуючы выявіць патрыётаў, якія не давалі ім спакойна таптаць савецкую зямлю.

У канцы лета 1943 года дні і ночы ішлі аблавы, вобыскі, арышты. Калі па даносе здрадніка была схоплена частка юных падпольшчыкаў, фашысты адмаўляліся верыць, што столькі шкоды ім нанеслі звычайныя школьнікі. Яны былі ўпэўнены, што выбухі на чыгунцы, на шашы, лістоўкі, падпалы — справа рук дарослых партызанаў.

605 дзён і начэй змагалася падпольная арганізацыя «Юныя мсціўцы». На яе рахунку — 22 буйныя дыверсіі. І Зіна Партнова мае дачыненне да кожнай з іх. А адну, асабліва небяспечную, дзяўчынка выканала асабіста. У дзённіку камісара партызанскага атрада імя Варашылава Барыса Маркіянава ёсць запіс пра яе подзвіг. Зіне было даручана ў кацёл з ежай для фашыстаў падсыпаць атруту. Тады піянерка працавала на кухні: абірала бульбу, калі-нікалі мыла посуд. Выбраўшы момант, прыўзнялася на дыбачкі і ўсыпала парашок з пакеціка ў варыва на пліце. Пасля абеду гітлераўцы атруціліся, і выхад са сталоўкі быў блакіраваны гестапаўцамі, якія правяралі ўсіх, каб выявіць вінаватага ў дыверсіі. Паставілі талерку супу і перад Зінай, загадалі есці. Выбару не было: калі адмовіцца — адразу здагадаюцца, а калі з'есць — памрэ ад атруты. Дзяўчынка адкусіла кавалак хлеба, праглынула лыжку супу. Ёй паверылі і адпусцілі дадому. Падпольшчыкі перапраўлялі атручаную Зіну да партызанаў, у шпіталі яе выхадзілі. А больш за 100 эсэсаўцаў знайшлі апошні прытулак на магілках.

16 снежня 1943 года Зіна пайшла на апошняе заданне. Яна павінна была з дупла дуба забраць звесткі ад пуцявога абходчыка пра эшалоны, што прайшлі праз станцыю Обаль. Але дупло аказалася пустым. Зіна накіравалася ў вёску. Ёй карцела даведацца, хто выдаў фашыстам яе таварышаў. 12 чалавек з арганізацыі былі схоплены і расстраляны. Грачухін (прозвішча здрадніка) убачыў яе праз акно і сказаў гітлераўцу, якога пасяліў у яго хаце, што вось ідзе партызанка.

Зіну схапілі. Кожную раніцу яе выводзілі на допыты. Каталі, але, як ні стараліся, ніякіх звестак ад Зіны атрымаць не ўдалося. Тады за справу ўзяўся вядомы сваёй жорсткасцю начальнік гестапа Краўзе. Ён прымяняў розныя спосабы, каб зламаць дзяўчынку. Не змог. Дапамагла Зіне яго неабачлівасць. Ён паклаў на стол пісталет, а сам падышоў да акна. Зіна скарысталася ім імгненна: забіла свайго ката з яго ж зброі. Пазбавіла жыцця і дзяжурнага афіцэра, які зазірнуў у кабінет, а потым, выбіўшы аконную шыбу, пабегла да рэчкі, каб схавацца ў прыбярэжных кустах. Але ўслед ужо мчаліся гітлераўцы. Яна паспела стрэліць яшчэ ў аднаго фашыста, але была схоплена. Яе зноў білі, здзекаваліся, дзяўчыны выкалалі вочы, адрэзалі вушы, раздрабілі пальцы, ды не здолелі пахіснуць яе дух. Месяц і чатыры дні юную разведчыцу трымалі ў засценках гестапа. А марознай студзеньскай раніцай 1944-га, калі ўжо быў чутны гул цяжкіх гармат наступаючых савецкіх войск, 17-гадовую сляпую і сівую дзяўчыну з распухлых пачарнелымі нагамі вывелі на расстрэл. Грымнуў залп, і Зіна Партнова зрабіла крок у бессмяротнасць. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Зінаіда Мартынаўна Партнова ўдастоена звання Героя Савецкага Саюза.

У лютым вечна юнай Зіне Партновай споўнілася б 90 гадоў. Дзень яе нараджэння гадзінай памяці «Наша маленькая бясстрашная разведчыца» адзначылі ў Обальскай сярэдняй школе, якая носіць імя гераіні. У Санкт-Пецярбургу сястра Зіны Галіна Партнова-Мельнікава ў музеі ў сваёй кватэры сабрала прыхільнікаў памяці адважнай падпольшчыцы, у тым ліку членаў ваенна-патрыятычнага клуба «Штрафбат».

**Таццяна КУЗЬМІЧ.**

*г. Віцебск.*

# НА СЛУЖБУ — КРОКАМ МАРШ!

***(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)***

У элітныя часці, акрамя ўсяго іншага, патрэбны юнакі з устойлівай псіхікай, з лагічным мысленнем. Тым, у каго былі судзімасці ці іншыя правапарушэнні, там не месца. Калі па пэўных паказчыках малады чалавек падыходзіць у канкрэтную воінскую часць, то чаму б і не? У такім выпадку ваенныя камісарыяты ідуць насустрач. Часам прызыўнікі самі едуць у воінскую часць, дамаўляюцца з камандзірам. І, бывае, камандаванне бярэ іх на службу, нават калі ёсць нязначныя адхіленні па стане здароўя.

***— Тэрытарыяльны прынцып камплектавання падчас выбару месца службы таксама ўлічваецца?***

— У асноўным так і ёсць. Але не заўсёды. Напрыклад, у нас толькі дзве мабільныя брыгады: 38-я ў Брэсце і 103-я ў Віцебску. Вядома, той жа Віцебск не зможа скамплектаваць злучэнне толькі мясцовымі жыхарамі. Адны мы кожны прызыў накіроўваем у Віцебск каля сотні чалавек. Прызыўнікі з усёй Беларусі папаўняюць і брыгаду спецыяльнага прызначэння, іншыя воінскія падраздзяленні. Неабходна, каб у абласцях таксама быў рэзерв гэтых спецыялістаў.

***— Многія прызыўнікі мараць служыць у так званых элітных войсках. Ці шмат жыхароў Міншчыны ўвойдуць вясной у гэтыя ганаровыя шэрагі?***

— Ахвотнікаў заўсёды шмат, але многія прызыўнікі не падыходзяць у элітныя войскі па стане здароўя. У той жа спецназ — вайсковы або Міністэрства ўнутраных сіл — юнакі ідуць без абмежаванняў па стане здароўя. Як і ў 103-ю і 38-ю мабільныя брыгады. На жаль, сёння абсалютна здаровых маладых людзей мала. Хоць і не скажу, што дзеці хворыя. З кожным годам медыцынская дыягностыка ўдасканальваецца, што дазваляе нам выявіць пэўныя захворванні ў раннім узросце.

***— Ці шмат ахвотных служыць па кантракце без праходжання тэрміновай службы?***

— Даволі шмат. Напрыклад, да нас, у Ваенны камісарыят Мінскай вобласці, нядаўна на кантрактную службу прыйшлі два маладыя хлопцы: адзін — у вузел сувязі, другі — на пасаду кіроўцы. Маладых людзей прываблівае такая перспектыва: служыць два гады замест паўтара, ды яшчэ атрымліваць за гэта грошы. Але трэба добра разумець, што аднаго жадання тут недастаткова. Улічваюцца стан здароўя, маральна-дзелавыя якасці кандыдата на кантрактную службу. Не возьмуць на службу па кантракце і без адпаведнай адукацыі. Гэта павінен быць ужо падрыхтаваны спецыяліст, які атрымаў роднасную спецыяльнасць на «грамадзянцы». На кантрактную службу, як правіла, ідуць мэтанакіраваныя маладыя людзі, якія плануюць звязаць сваё жыццё з арміяй.

***— Ці ёсць у гэтым прызыве тыя, хто аддае прыярытэт альтэрнатыўнай службе?***

— Такіх прызыўнікоў у нас пакуль не было. Ды мне здаецца, што, хутчэй за ўсё, гэты від службы ў нас не прыжывецца. Хаця б па той прычыне, што ў такім варыянце прадугледжаныя большы тэрмін службы і невялікі заробак.

***— Што пажадаеце прызыўніку, які неўзабаве пойдзе ў войска?***

— Не варта баяцца служыць ва Узброеных Сілах. Радзіма ў нас адна, і неабходна зрабіць усё дзеля таго, каб нашы дзеці і ўнукі жылі спакойна, не хваляваліся за сваю будучыню, за будучыню сваіх нашчадкаў.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Боегатоўнасць

# СУПРАЦЬСТАЯЦЬ ПАГРОЗАМ

## Беларускія вайскоўцы ўдасканальвалі сваё майстэрства падчас вучэння АДКБ у Таджыкістане

**Сумеснае спецыяльнае вучэнне «Пошук-2016» з сіламі і сродкамі разведкі ўзброеных сіл дзяржаў — членаў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы завяршылася ўчора ў Таджыкістане. У такім фармаце вучэнне праходзіла ўпершыню. Яго актыўнымі ўдзельнікамі сталі і ваеннаслужачыя беларускай арміі, якія прадставілі органы радыёэлектроннай, вайсковай і спецыяльнай разведкі.**

Разам з вайскоўцамі з Расіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана нашы армейцы правялі разведку ў гарах, адпрацавалі сумесныя дзеянні па захопе і знішчэнні аб'ектаў умоўнага праціўніка. Усяго ў маштабных манеўрах было задзейнічана каля паўтары тысячы ваеннаслужачых, акрамя таго, падраздзяленні армейскай, аператыўна-тактычнай і ваенна-транспартнай авіяцыі.

— Гэта першыя такія вучэнні ў рамках Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, — падкрэсліў **генеральны сакратар АДКБ Мікалай БАРДЗЮЖА**. — Яны праводзяцца па рашэнні Савета міністраў абароны. Звязана гэта з неабходнасцю адпрацоўкі сістэмы разведкі, выяўлення, пошуку шматлікіх дыверсійных, тэрарыстычных груп, якія могуць трапіць на тэрыторыю нашых дзяржаў, і іх знішчэння. Галоўныя задачы вучэння — адпрацоўка пытанняў кіравання сродкамі разведкі розных дзяржаў — членаў АДКБ, а таксама атрыманне спецпадраздзяленнямі ваеннай разведкі навыку для сумесных дзеянняў.

Як адзначыў **міністр абароны Таджыкістана Шэралі МІРЗО**, сітуацыя ў Цэнтральнаазіяцкім рэгіёне застаецца няпростай і будзе мець тэндэнцыю да абвастрэння. «Праява міжнароднага тэрарызму, які ўжо выходзіць за межы раз'яднаных груп і ператвараецца ў магутную ваенізаваную сілу, эскалацыя шматлікіх канфліктаў у непасрэднай блізкасці ад нашых межаў — гэта рэаліі, з якімі мы сёння сутыкаемся і абавязаны змагацца, — заявіў генерал-лейтэнант. — Арганізаваць эфектыўную барацьбу і супрацьстаяць гэтым пагрозам можна толькі агульнымі скаардынаванымі намаганнямі».

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# КАХАННЕ. АДЗІНАЕ ВАЖНАЕ

## ПРАЙГРАНЫ ПАЯДЫНАК

Але не толькі пра вечныя тэмы — каханне і смерць — прапануе паразважаць гледачу Вячаслаў Паўлюць, які, дарэчы, з'яўляецца акцёрам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і загадчыкам кафедры майстэрства акцёра Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Яго рэжысёрскі дэбют на сцэне Драматычнага тэатра Беларускай арміі напоўнены пастаноўкай самых розных злабадзённых праблем. Вечны паядынак паміж двума родамі, які адбываецца на працягу ўсяго сюжэта, рэжысёр выдатна абыграў з дапамогай футбольнага поля, адлюстраванага на падлозе. Толькі пераможца ў гэтай «футбольнай гульні» вызначаецца не колькасцю забітых галоў, а лікам... забітых. Мантэкі і Капулецці страчваюць членаў сваіх сем'яў — спецыяльны таймер, усталяваны пасярэдзіне сцэны, адлічвае, колькі засталося жывых з кожнага боку.



Урэшце лік робіцца роўным. На табло — чатыры нулі. І гэта значыць, што ў паядынку паміж сем'ямі няма пераможцаў, ёсць толькі загінуўшыя... Антонія і Разаліну спасціг лёс Рамэа і Джульеты. Замест пярсцёнкаў яны надзяваюць кайданы і галышом крочаць па горадзе. Потым скажуць, што натоўп закідаў іх камянямі. Іншыя ж будуць сцвярджаць, што зрабіць чорную справу перашкодзіў туман, пад покрывам якога закаханыя здолелі ўцячы.

— Чым усё скончылася, няхай гледачы вырашаць самі, — тлумачыць фінальную сцэну Вячаслаў Паўлюць. — Калі вам бліжэй, што галоўных герояў забілі, няхай будзе так. Калі вам іх было шкада і вы на іх баку, уздыхніце спакойна: для вас яны засталіся жывымі. У маёй галаве быў і яшчэ адзін фінал. Калі ўсё скончылася, на сцэну выходзяць двое маленькіх дзетак: сынок галоўнага героя і дачушка галоўнай гераіні. Іх завуць Рамэа і Джульета...

## СПЛАЎ ВОПЫТУ І МАЛАДОСЦІ

На адной сцэне з прафесійнымі акцёрамі іграюць студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Як прызнаюцца карыфеі тэатра, яны вельмі ажывілі спектакль.

— Артыст толькі ў тэатры становіцца артыстам, як бы яго ні вучылі, — пераканана **мастацкі кіраўнік Драматычнага тэатра Беларускай арміі Марына ДУДАРАВА**. — Гэта вялікі вопыт для студэнтаў. Выконваючы свае першыя ролі, яны глядзяць і на старэйшых калег, вучацца ў іх чамусьці.

**Галоўны рэжысёр тэатра Ігар ФІЛЬЧАНКОЎ** каторы раз прымярае на сабе акцёрскую мантыю. У спектаклі «Чума на абодва вашы дамы» ён — сіньёр Капулецці. Цікава, што яшчэ пад час працы ў Беларускім дзяржаўным маладзёжным тэатры Ігар Фільчанкоў іграў Рамэа, у трагедыі Шэкспіра на сцэне тэатра Беларускай арміі ён — манах Ларэнца.

— Такога мяне гледачы яшчэ не бачылі, — расказвае пра сваю новую ролю акцёр. — Сіньёр Капулецці ў пастаноўцы мне вельмі падабаецца. Праўда, я выконваю ролю такога падабацніка. Але разам з тым мне імпануе тое, што як Мантэкі, так і Капулецці ўласцівы моцныя сямейныя традыцыі. Гэта спектакль не толькі пра каханне. Ён і пра сумленне, пра абавязак. Адсюль і злабадзённасць пастаноўкі.

Нягледзячы на тое, што рэжысёр-пастаноўшчык перасякаўся з акцёрамі тэатра на розных пляцоўках, працуе ён з імі ўпершыню. «Акцёры тэатра Беларміі падаліся мне вельмі апантанымі, — прызнаецца Вячаслаў Паўлюць. — Гэта людзі, хворыя на сваю прафесію, — у добрым сэнсе слова. У прынцыпе, і ноты можна навучыць іграць на трамбоне. Але зрабіць якасную працу дапаможа вялікае жаданне, што і адбылося. Я шчаслівы, што з імі працую».

— Калі ў спектаклі «Рамэа і Джульета», які мы ўжо каторы год ставім на гэтай сцэне, харэаграфіі і драматычнага дзеяння — 50 на 50, то ў гэтай пастаноўцы больш драматычнага дзеяння, — гаворыць Марына Дударава. — Але атмасфера нечага прыгнятальнага, небяспечнага — таго, што характэрна для перыяду чумы ў Італіі, — створана менавіта з дапамогай харэаграфіі. Мы найлепш сюжэт «Рамэа і Джульеты» да нашага часу. І спадзяёмся, перадалі самае галоўнае, што падкрэсліў у сваім творы Горын: каханне вечнае ва ўсе часы. І як бы ні складваліся падзеі, каханне — адзінае, што важна на гэтым свеце.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)***

## ЛОГОЙСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

### сообщает о проведении 25 мая 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Инженерная инфраструктура | Начальная цена, руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Силичи, ул. Курортная, д. 4 623284605401000312 | 0,1086 | водоснабжение, газоснабжение | 29 234 400 | 14 576 100 + реклама | 2 923 500 |
| 2 | аг. Косино, ул. Школьная, д. 2В 623284603201000310 | 0,1246 | водоснабжение, газоснабжение | 32 079 300 | 14 235 500 + реклама | 3 208 000 |

Земельный участок в д. Силичи, ул. Курортная, д. 4 имеет ограничения в использовании площадью 0,1086 га в связи с расположением в водоохранной зоне пруда.

*Задаток в размере 10% от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с 3600619101109 в ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ул. Пролетарская, 1, УНН 600181577, код 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой землеустроительной документации. Все участники могут ознакомиться с земельными участками и документацией на них. Иные обязанности победителя торгов и порядок проведения аукциона оговорены в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 25 мая 2016 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, д. 6.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6.

**Последний день приема заявлений – 19 мая 2016 года до 17.00.**

Контактные телефоны: (801774) 55056, 28473.

## Управляющий ООО «ПрофДМ» проводит повторные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ДУП «ПМК-199» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690018982), а именно:

| № | Описание | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Административно-бытовое здание, общ. пл. 636,1 кв.м и условный земельный участок, расположенный по адресу: Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 35В | **602 796 750** |
| 2 | Помещение АТС (изолированное) общ. пл. 45,3 кв.м (в составе: помещение – 38,06 кв.м, помещение – 6,7 кв.м), расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Мелиоративная, 15Б | **115 455 750** |
| 3 | Блок бытового обслуживания (изолированное помещение) общ. пл. 467,3 кв.м (в составе: кладовая – 3,6 кв.м, кладовая – 5,3 кв.м, коридор – 4,3 кв.м, помещение – 5,0 кв.м, коридор – 16,6 кв.м, коридор – 19,8 кв.м, сан. узел – 5,5 кв.м, сан. узел – 4,2 кв.м, сан. узел – 3,9 кв.м, помещение – 10,0 кв.м, помещение – 13,8 кв.м, помещение 275, 1 кв.м, подвальное помещение 100,2 кв.м.), расположенное по адресу: Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Мелиоративная, 15Б. | **831 159 000** |

**Аукцион состоится 06.05.2016 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1 – 1132 (1118-27).**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 21.04.2016 по 05.05.2016 г.**

Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества должника, выставляемого на торги. Задаток перечисляется на следующие реквизиты: *р/с № 3012401820017 в РКЦ 21 в филиале ОАО «Белагропромбанк» г. Борисова, код 942, УНП 690018982.*

По вопросу участия в аукционе, ознакомления с предметами торгов, а также по всем иным интересующим вопросам, связанным с проведением торгов, обращаться по тел.: +375 (17) 395-81-34; +375 (29) 698-51-76.

## Ликвидатор объявляет о продаже следующего имущества ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690019233):

**Таблица №1**

| № лота п/п | Наименование и краткая характеристика предмета торгов (движимое имущество) | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Сварочный аппарат НТС КАВИК | 144 018 |
| 2 | Копировальный аппарат IR1600 | 467 586 |
| 3 | Емкость для хранения нефтепродуктов, 11 $м^3$ | 1 395 135 |
| 4 | Емкость, объем 78 $м^3$ | 2 510 928 |
| 5 | Емкость, объем 78 $м^3$ | 2 510 928 |
| 6 | Заточный станок, инв. 1048 | 216 342 |
| 7 | Плиты перекрытия 3,25x1,45 м | 32 288 |
| 8 | Фундаментная подушка 1,95x50 (кол-во: 13 шт.) | 307 125 |
| 9 | Емкость на колесах объем 2 м.куб. (инв. №72) | 1 707 000 |

*Торги в отношении имущества, указанного №№1–8 таблицы №1, проводятся повторно седьмой раз, №9 таблицы №1 повторно третий раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 09.04.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов движимого имущества лоты №№1–8 таблицы №1 снижена на 95%, лот №9 таблицы №1 снижена на 50%.*

**Таблица №2**

| № лота п/п | Наименование и краткая характеристика предмета торгов (недвижимое имущество) | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. №663/С-10604, общая площадь, кв.м – 941,7, расположенное по адресу: город Мядель, ул. Интернациональная, 17 на земельном участке площадью 2,5099 га с кадастровым №624050100001001502 на праве постоянного пользования | 127 764 000 |

*Торги в отношении недвижимого имущества, указанного в таблице №2, проводятся повторно пятый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 09.04.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 70%.*

**Таблица №3**

| № лота п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кабель сварочный | пог.м | 24,00 | 28 732 |
| 2 | Провод ПВС 3,0x1,5 | м | 120,00 | 148 502 |
| 3 | Провод 2x6 б/у | м | 100,00 | 144 000 |
| 4 | Сетка плетен. зелёная | рул. | 2,00 | 496 800 |
| 5 | Удлинитель 10.9 | шт. | 1,00 | 31 180 |
| 6 | Арматура (в ассортименте) | кг | 970,92 | 1 513 381 |
| 7 | Блок балконный | $м^2$ | 20,83 | 631 040 |
| 8 | Блок дверной | $м^2$ | 10,00 | 281 594 |
| 9 | Блок оконный | $м^2$ | 26,92 | 1 490 625 |
| 10 | Блок оконный 4,5-6 | шт. | 6,00 | 113 350 |
| 11 | Ванна чугунная 170x70 | шт. | 1,00 | 541 892 |
| 12 | Вентель | шт. | 30,00 | 61 071 |
| 13 | Воронка расширительная | шт. | 8,00 | 27 606 |
| 14 | Головка д.50 | шт. | 11,00 | 56 549 |
| 15 | Дверь подвальная | шт. | 19,00 | 2 451 420 |
| 16 | Доска п/оконная | пог.м | 127,80 | 863 914 |
| 17 | Доска подоконная | $м^2$ | 3,33 | 48 929 |
| 18 | Доска подоконная окраш. | $м^2$ | 16,02 | 719 454 |
| 19 | Кабель 1x16 б/у | м | 34,00 | 66 953 |
| 20 | Конек | шт. | 5,00 | 19 525 |
| 21 | Контрогайка | шт. | 357,00 | 68 660 |
| 22 | Кран шаровой | шт. | 29,00 | 170 983 |
| 23 | Крепление для кронштейна | шт. | 153,00 | 40 652 |
| 24 | Лючок 200x400 | шт. | 1,00 | 17 408 |
| 25 | Нагреватель воздуха газ. | шт. | 1,00 | 314 494 |
| 26 | Нагреватель промышленный | шт. | 1,00 | 166 031 |
| 27 | Окно ОД 10.9.9 | шт. | 3,00 | 1 356 557 |
| 28 | Отвод | шт. | 1 007,00 | 463 434 |
| 29 | Планка | шт. | 15,00 | 67 093 |
| 30 | Планка торцовая | пог.м | 209,00 | 1 878 542 |
| 31 | Провод САПС б/у | м | 68,20 | 70 954 |
| 32 | Рама | шт. | 17,00 | 207 358 |
| 33 | Рейка 2 метра | шт. | 1,00 | 20 160 |
| 34 | Рейка контрольная | шт. | 2,00 | 49 619 |
| 35 | Рейка контрольная | шт. | 1,00 | 36 792 |
| 36 | Смеситель | шт. | 4,00 | 53 448 |
| 37 | СПД 10-4-10-4-10-стеклопакеты | $м^2$ | 2,20 | 43 769 |
| 38 | Стекло оконное | $м^2$ | 10,37 | 36 107 |
| 39 | Стеклоткань | м | 88,00 | 90 394 |
| 40 | Труба Д-150-ЧВ | шт. | 2,00 | 95 740 |
| 41 | Труба ПНД 160x4 м | шт. | 4,00 | 170 496 |
| 42 | Хомут 90 | шт. | 65,00 | 56 934 |
| 43 | Цветочница | шт. | 3,00 | 345 600 |
| 44 | Чаша | шт. | 2,00 | 63 456 |
| 45 | Черепица | шт. | 222,00 | 15 617 |
| 46 | Черепица вентиляционная | шт. | 37,00 | 102 333 |
| 47 | Черепица пазовая | шт. | 132,00 | 63 204 |
| 48 | Черепица половинчатая | шт. | 120,00 | 127 296 |
| 49 | Черепица проходная | шт. | 10,00 | 26 448 |
| 50 | Черепица снегозадерживающая | шт. | 62,00 | 156 984 |
| 51 | Черепица фронтонная левая | шт. | 8,00 | 11 514 |
| 52 | Шайба | кг | 31,50 | 52 815 |
| 53 | Швеллер | кг | 157,60 | 215 862 |
| 54 | Щиты подмостей | $м^2$ | 4,91 | 15 068 |
| 55 | Осушитель воздуха б/у | шт. | 1 | 270 000 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №3, проводятся повторно пятый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 09.04.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 80%.*

**Таблица №4**

| № лота п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Аппарат телефонный | шт. | 2,000 | 90 000 |
| 2 | Балка настила | шт. | 24,000 | 531 605 |
| 3 | Бачок оцинкованный | шт. | 24,000 | 25 120 |
| 4 | Блоки г/с б/у обрезки. бой | $м^3$ | 23,970 | 2 987 266 |
| 5 | Блоки газосиликатные б/у | $м^3$ | 0,140 | 6 531 |
| 6 | Ванна б/у | шт. | 1,000 | 181 268 |
| 7 | Вентрешетки | шт. | 67,000 | 889 418 |
| 8 | Вибратор | шт. | 2,000 | 770 186 |
| 9 | Вибратор б/у | шт. | 5,000 | 1 715 747 |
| 10 | Гвоздодер | шт. | 1,000 | 16 550 |
| 11 | Гибкий вал | шт. | 2,000 | 225 839 |
| 12 | Гибкий вал б/у | шт. | 1,000 | 135 950 |
| 13 | Горизонталь | шт. | 20,000 | 154 909 |
| 14 | Дрель аккумуляторная | шт. | 1,000 | 241 475 |
| 15 | Заготовка из листа | шт. | 11,000 | 48 708 |
| 16 | Заготовка из трубы | шт. | 2,000 | 16 981 |
| 17 | Заготовка оцинков. | кг | 256,200 | 18 053 |
| 18 | Задвижка б/у | шт. | 2,000 | 46 808 |
| 19 | Задвижка накладная | шт. | 25,000 | 10 614 |
| 20 | Заземляющий элемент | шт. | 1,000 | 7 866 |
| 21 | Закладные детали | шт. | 3,000 | 30 015 |
| 22 | Заклепочник | шт. | 1,000 | 48 574 |
| 23 | Закрепа | шт. | 620,000 | 22 622 |
| 24 | Защёлка ЗЩ | шт. | 10,000 | 68 872 |
| 25 | Звонок электрический | шт. | 1,000 | 13 715 |
| 26 | Змейка | шт. | 1,000 | 8 970 |
| 27 | Знаки дорожные | шт. | 17,000 | 394 561 |
| 28 | Калькулятор | шт. | 4,000 | 102 636 |
| 29 | Калькулятор нераб. | шт. | 5,000 | 36 014 |
| 30 | Калькулятор-1 | шт. | 3,000 | 158 450 |
| 31 | Каска строительная | шт. | 5,000 | 50 285 |
| 32 | Колонны | $м^3$ | 3,020 | 14 129 |
| 33 | Краги | шт. | 6,000 | 28 210 |
| 34 | Кронштейн для умывальника | шт. | 8,000 | 26 554 |
| 35 | Крючок для вязки арматуры | шт. | 1,000 | 210 000 |
| 36 | Кусачики боковые | шт. | 1,000 | 13 281 |
| 37 | Лом | шт. | 2,000 | 20 906 |
| 38 | Лопата | шт. | 6,000 | 31 934 |
| 39 | Лопата для очистки снега | шт. | 1,000 | 16 788 |
| 40 | Лотки ж/б | $м^3$ | 3,470 | 73 941 |
| 41 | Миксер малярный | шт. | 1,000 | 17 749 |
| 42 | Молоток Сат. | шт. | 1,000 | 68 670 |
| 43 | Молоток слесарный | шт. | 4,000 | 28 199 |
| 44 | Набор инструментов | шт. | 1,000 | 80 839 |
| 45 | Набор отвёрток | шт. | 1,000 | 13 368 |
| 46 | Набор щупов | шт. | 2,000 | 21 000 |
| 47 | Наволочка 70x70 | шт. | 25,000 | 226 200 |
| 48 | Напильник | шт. | 2,000 | 20 165 |
| 49 | Одеяло п/шерстяное | шт. | 3,000 | 135 898 |
| 50 | Одеяло п/шерстяное 09с-3 | шт. | 1,000 | 33 255 |
| 51 | Отбойный молоток | шт. | 1,000 | 215 085 |
| 52 | Отвертка | шт. | 7,000 | 33 293 |
| 53 | Отвес строительный | шт. | 8,000 | 67 032 |
| 54 | Поддоны деревян. | шт. | 2,000 | 96 490 |
| 55 | Патрон б/у | шт. | 5,000 | 17 393 |
| 56 | Перемычки г/силикатные | $м^3$ | 0,069 | 80 267 |
| 57 | Перемычки ж/б | $м^3$ | 0,672 | 1 060 548 |
| 58 | Переноска | шт. | 2,000 | 52 265 |
| 59 | Переноска А | шт. | 2,000 | 40 753 |
| 60 | Переноска д. 10 | шт. | 2,000 | 71 224 |
| 61 | Петля накладная ПН1-110 | шт. | 4,000 | 24 999 |
| 62 | Петля оконная | шт. | 26,000 | 12 647 |
| 63 | Петля ПН-130 | шт. | 63,000 | 150 404 |
| 64 | Пила лобзиковая электрическая | шт. | 1,000 | 282 000 |
| 65 | Пила ручная электрич. | шт. | 1,000 | 387 000 |
| 66 | Плотнометр | шт. | 1,000 | 141 000 |
| 67 | Плита ж/б б/у | $м^3$ | 5,130 | 1 367 999 |
| 68 | Плитка бетонная тротуарная | $м^2$ | 6,660 | 164 498 |
| 69 | Плоскогубцы | шт. | 5,000 | 74 129 |
| 70 | Поддоны Радош. | шт. | 51,000 | 1 836 000 |
| 71 | Поддоны 1030x1030 | шт. | 28,000 | 1 285 560 |
| 72 | Поддоны ЗСМ | шт. | 1,000 | 56 919 |
| 73 | Поддоны ДОЗ | шт. | 2,000 | 114 936 |
| 74 | Поддоны П2-2,4 930x1230 | шт. | 5,000 | 236 330 |
| 75 | Подушка 58x58 | шт. | 4,000 | 50 321 |
| 76 | Подушка ж/б | $м^3$ | 3,496 | 750 886 |
| 77 | Подушка пост. | шт. | 3,000 | 34 578 |
| 78 | Подушки 68x68 | шт. | 3,000 | 56 747 |
| 79 | Подшлемник | шт. | 15,000 | 74 723 |
| 80 | Покрывало | шт. | 2,000 | 32 146 |
| 81 | Полоса | кг | 175,820 | 805 147 |
| 82 | Полотнище с рукавицами | шт. | 2,000 | 63 360 |
| 83 | Простынь 1,5 м | шт. | 40,000 | 522 000 |
| 84 | Профиль потолочный ПЛ 60-27 | пог.м | 162,000 | 536 544 |
| 85 | Пылесос | шт. | 1,000 | 88 325 |
| 86 | Радиаторы 2К60П | шт. | 14,000 | 721 291 |
| 87 | Ремень стяжной | шт. | 1,000 | 53 886 |
| 88 | Розетка потолочная | шт. | 8,000 | 6 751 |
| 89 | Розетка РА 10-214 б/у | шт. | 6,000 | 47 998 |
| 90 | Розетка РА 16-263 б/у | шт. | 2,000 | 34 400 |
| 91 | Розетка РА16-255 б/у | шт. | 7,000 | 36 750 |
| 92 | Розетка РС16 б/у | шт. | 2,000 | 15 700 |
| 93 | Рулетка 7,5 м | шт. | 1,000 | 28 999 |
| 94 | Связь диагональная | шт. | 6,000 | 87 936 |
| 95 | Сетка-рябица б/у | $м^2$ | 18,000 | 147 198 |
| 96 | Стулья | шт. | 17,000 | 927 567 |
| 97 | Тачка | шт. | 2,000 | 522 979 |
| 98 | Телефонный аппарат | шт. | 3,000 | 71 797 |
| 99 | Тёрка пенопласт | шт. | 11,000 | 113 090 |
| 100 | Тёрка пенопласт | шт. | 6,000 | 104 897 |
| 101 | Термометр ПТП | шт. | 1,000 | 11 249 |
| 102 | Термометр ТБП | шт. | 1,000 | 21 600 |
| 103 | Удлинитель 10.9 | шт. | 2,000 | 155 900 |
| 104 | Форма забора | шт. | 4,000 | 1 233 678 |
| 105 | Форма куба | шт. | 2,000 | 174 000 |
| 106 | Эл. плита 3-комф. | шт. | 1,000 | 577 823 |
| 107 | Эл. рубанок | шт. | 1,000 | 265 200 |
| 108 | Эл. рубанок | шт. | 1,000 | 367 500 |
| 109 | Ящик для инструмента | шт. | 1,000 | 35 498 |
| 110 | Ящик для инструмента б/у | шт. | 1,000 | 40 800 |
| 111 | Трансформатор сварочный | шт. | 1,000 | 2 340 000 |
| 112 | Трансформатор | шт. | 1,000 | 421 440 |
| 113 | Трансформатор | шт. | 1,000 | 604 446 |
| 114 | Трансформатор б/у | шт. | 2,000 | 107 582 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблице №4, проводятся повторно второй раз. Публикация об аукционе ранее публиковалась 09.04.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 50%.*

**Таблица №5**

| №п/п лота | Наименование и краткая характеристика предмета торгов (движимое имущество) | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Бак для нефтепродуктов 3 м.куб (инв. 807) | 2 866 800 |
| 2 | Бак для нефтепродуктов 3 м.куб (инв. 822) | 2 866 800 |
| 3 | Бак для нефтепродуктов 3 м.куб (инв. 788) | 2 150 400 |
| 4 | Емкость, 2 м.куб (инв. 74) | 1 762 800 |
| 5 | Емкость для мастики, 8 м.куб (инв. 75) | 4 053 600 |
| 6 | Емкость, 50 м.куб (инв. 68) | 12 069 600 |
| 7 | Рубильный станок (инв. 87) | 14 692 800 |
| 8 | Протяжной станок (инв. 85) | 14 692 800 |
| 9 | Сверлильный аппарат (инв. 1028) | 1 358 400 |
| 10 | Станок для гнутия арматуры (инв. 88) | 2 851 200 |
| 11 | Станок фрезерный (инв. 84) | 18 139 200 |
| 12 | Прицеп тракторный 2ПТС4 (инв. 5554) | 9 518 400 |

**Таблица №6**

| № лота п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомат ВА47-63 б/у | шт. | 1 | 34 300 |
| 2 | Богры пожарные | шт. | 2 | 58 411 |
| 3 | Вилка | шт. | 2 | 20 977 |
| 4 | Жгут Изонел | м | 245 | 290 666 |
| 5 | Зубило | шт. | 1 | 20 000 |
| 6 | Зубило | шт. | 100 | 2 000 000 |
| 7 | Кирпич керамический б/у | усл. шт. | 1000 | 1 560 000 |
| 8 | Кирпич силик 250x120x85 б/у | усл. шт. | 7042 | 7 605 360 |
| 9 | Клин | шт. | 1,000 | 119 700 |
| 10 | Котел В-02 | шт. | 2,000 | 12 384 |
| 11 | Кресло театральное | шт. | 21,000 | 504 000 |
| 12 | Насос «Гном» б/у неиспр. | шт. | 2,000 | 934 920 |
| 13 | Насос б/у неиспр. | шт. | 2,000 | 216 695 |
| 14 | Насос б/у нераб. | шт. | 1,000 | 108 347 |
| 15 | Насос Ручеёк б/у | шт. | 1,000 | 159 854 |
| 16 | Насос ЭЦВ б/у неиспр. | шт. | 3,000 | 1 390 505 |
| 17 | Пояс предохранительный б/у | шт. | 1,000 | 50 388 |
| 18 | Ревизия | шт. | 55,000 | 194 082 |
| 19 | Связь | шт. | 15,000 | 190 504 |
| 20 | Сейф | шт. | 4,000 | 8 220 |
| 21 | Сиденье к унитазу | шт. | 4,000 | 60 598 |
| 22 | Стальная набивка | шт. | 43,700 | 3 696 |
| 23 | Суг | шт. | 1,000 | 62 976 |
| 24 | Счетчик СОб/у | шт. | 6,000 | 345 008 |
| 25 | Счетчик электрический б/у | шт. | 3,000 | 858 497 |
| 26 | Телефон маг-н | шт. | 1,000 | 132 |
| 27 | Толщинометр | шт. | 1,000 | 300 000 |
| 28 | Трап чугунный | шт. | 11,000 | 360 360 |
| 29 | Туалет | шт. | 2,000 | 608 258 |
| 30 | Тэн б/у | шт. | 5,000 | 142 380 |
| 31 | Угловой масштаб | шт. | 1,000 | 48 636 |
| 32 | Угломер | шт. | 1,000 | 300 000 |
| 33 | Урна | шт. | 1,000 | 192 |
| 34 | Щиток ЩО б/у | шт. | 1,000 | 215 107 |
| 35 | Электроплита 325947 | шт. | 1,000 | 1 301 172 |
| 36 | Электротепло-вентилятор | шт. | 1,000 | 2 006 724 |
| 37 | Ящик каменщика | шт. | 13,000 | 7 534 308 |
| 38 | Ящик силовой б/у | шт. | 1,000 | 325 182 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблицах №№5–6, проводятся впервые.*

**Таблица №7**

| № лота п/п | Наименование и краткая характеристика предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|
| 1 | Выпрямитель ВД-306 С1 (инв. 111) | 2 801 520 |
| 2 | Битумный котел (большой) (инв. 23022016) | 5 599 800 |
| 3 | Битумный котел (большой) (инв. 24022016) | 5 027 400 |
| 4 | Битумный котел (маленький) (инв. 25022016) | 3 183 840 |
| 5 | Битумный котел (маленький) (инв. 26022016) | 2 723 760 |
| 6 | Битумный котел (круглая бочка) (инв. 933) | 2 681 640 |
| 7 | Компрессор ЗИФ-55 (инв. 4504) | 6 809 400 |
| 8 | Компрессор (инв. 80) | 2 407 320 |
| 9 | Кран-балка (инв. 27022016) | 24 499 800 |
| 10 | Кран-балка (инв. 28022016) | 24 499 800 |
| 11 | Кран-балка (инв. 29022016) | 24 499 800 |
| 12 | Кран-балка (инв. 30022016) | 24 499 800 |
| 13 | Молот кузнечный (инв.468) | 14 265 720 |
| 14 | Бетономешалка (инв.523) | 1 732 320 |
| 15 | Вибростанок (инв.1010) | 1 416 960 |
| 16 | Сварка точечная (инв. 86) | 6 310 440 |
| 17 | Бетоносмеситель (инв. 909) | 1 015 200 |
| 18 | Сверлильный аппарат (инв. 998) | 5 783 400 |
| 19 | Станок заточный (инв. 95) | 1 656 720 |
| 20 | Станция штукатурная (инв. 77) | 37 811 880 |

**Таблица №8**

| № лота п/п | Наименование | Ед. изм. | Кол-во | Начальная стоимость с учетом НДС 20% |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Богор | шт. | 1 | 26 285 |
| 2 | Гибкий вал | шт. | 2 | 406 510 |
| 3 | Гибкий вал б/у | шт. | 1 | 244 710 |
| 4 | Горизонталь | шт. | 20 | 278 837 |
| 5 | Грабли | шт. | 1 | 17 280 |
| 6 | Жалюзи | шт. | 3 | 193 428 |
| 7 | Жалюзные решетки | $м^2$ | 0,96 | 107 189 |
| 8 | Замок навесной | шт. | 6 | 158 492 |
| 9 | Замок поч | шт. | 9 | 116 640 |
| 10 | Известь | кг | 4 365 | 6 072 179 |
| 11 | Кабалка | кг | 6 | 23 419 |
| 12 | Ключи рабочие | шт. | 130 | 18 505 |
| 13 | Колонны | $м^3$ | 3,02 | 25 433 |
| 14 | Костюм сварщика | шт. | 2 | 180 073 |
| 15 | Костюм хлопчатобумажный | шт. | 3 | 202 027 |
| 16 | Нипель | шт. | 32 | 91 660 |
| 17 | Подвес | шт. | 64 | 113 990 |
| 18 | Полотно Г9 | шт. | 5 | 3 736 755 |
| 19 | Предохранитель ПН2 | шт. | 10 | 302 616 |
| 20 | Пробка | шт. | 6 | 40 020 |
| 21 | Пробка радиатора | шт. | 39 | 112 819 |
| 22 | Пробка радиаторная | шт. | 553 | 1 724 604 |
| 23 | Пробка-анкер (крепежная) | шт. | 10 | 105 635 |
| 24 | Прожектор б/у | шт. | 1 | 123 157 |
| 25 | Ригель под шипы | шт. | 23 | 912 696 |
| 26 | Ригель-анкер | шт. | 3 | 45 765 |
| 27 | Розетка б/у | шт. | 3 | 90 487 |
| 28 | Рубероид | $м^2$ | 15 | 43 200 |
| 29 | Рубильник б/у | шт. | 1 | 110 611 |
| 30 | Рукав | пог.м | 9,80 | 335 704 |
| 31 | Рукав кислородный | шт. | 1 | 78 313 |
| 32 | Рукав пневматический | шт. | 1 | 387 110 |
| 33 | Рукав резиновый для стр. отдел. работ | пог.м | 20 | 1 341 900 |
| 34 | Сапоги женс. Люкс | пар | 1 | 70 416 |
| 35 | Сгон оц. без компл. | шт. | 3 | 19 888 |
| 36 | Сгоны | шт. | 46 | 137 505 |
| 37 | Седелка ПЭ 110 | шт. | 3 | 108 291 |
| 38 | Сиделка | шт. | 8 | 76 252 |
| 39 | Сифон | шт. | 22 | 226 111 |
| 40 | Ствол РС-50 | шт. | 2 | 18 282 |
| 41 | Стержни к мол. | шт. | 5 | 23 247 |
| 42 | Стропа | шт. | 3 | 2 149 632 |
| 43 | Стропа | шт. | 1 | 201 189 |
| 44 | Ступени | $м^3$ | 0,77 | 204 897 |
| 45 | Тестер б/у | шт. | 1 | 186 300 |
| 46 | Ткань упаковочная | пог.м | 47 | 139 742 |
| 47 | Топор | шт. | 6 | 184 902 |
| 48 | Уголок | кг | 420 | 2 872 570 |
| 49 | Угольник | шт. | 1 | 58 860 |
| 50 | Угольник соединит. | шт. | 52 | 938 544 |
| 51 | Уровень бытовой ЛЗ-2000 мм | шт. | 1 | 75 978 |
| 52 | Футорка | шт. | 96 | 426 757 |
| 53 | Хризотилцементные муфты | шт. | 2 | 111 458 |
| 54 | Шланг высокого давления | шт. | 3 | 22 380 |
| 55 | Шланг поливочный | шт. | 1 | 35 240 |
| 56 | Шпилька резьбовая | шт. | 3 | 46 507 |
| 57 | Шпингалет дверной | шт. | 1 | 36 424 |
| 58 | Штангельциркуль | шт. | 1 | 33 907 |
| 59 | Штатив | шт. | 1 | 243 432 |

*Торги в отношении имущества, указанного в таблицах №№7–8, проводятся повторно первый раз. Публикация об аукционе ранее публиковалось 16.03.2016 г. в газете «Звязда». Цена на предметы торгов снижена на 10%.*

**Торги в виде аукциона состоятся 06 мая 2016 года в 12.00 по адресу: г. Мядель, ул. Интернациональная, д. 4 (по месту нахождения имущества). Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения предварительно согласовав дату и время с организатором торгов.**

Шаг аукциона – 5 процентов.

**Продавец – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой» (тел.: (017) 268-54-52).**

**Организатор торгов – ООО «Партнёр-Консультант» (220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1118-10, тел.: (017) 268-54-52 (Анастасия).**

Прием заявок начинается с момента выхода объявления, осуществляется по месту нахождения организатора торгов и прекращается за три дня до начала торгов.

*Задаток вносится до подачи заявления на участие в торгах в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов (с НДС) на р/с 3012452420020 в Филиале ОАО «Белагропромбанк», Минское областное управление, код 942, УНП 690019233, получатель – ДУП «ПМК-215» УП «Минскоблсельстрой», назначение платежа: задаток за предмет торгов.*

При признании торгов несостоявшимися в связи с наличием заявления на участие в них только от одного участника, возможна продажа предмета торгов этому участнику по цене, увеличенной на 5 процентов.

К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме с учетом НДС 20% не позднее 5 рабочих дней (30 рабочих дней для недвижимого имущества) с даты подписания договора купли-продажи.

■ Час вызначацца

# АДЗІН ДЗЕНЬ — У «ШКУРЫ» СТУДЭНТА,

## АБО ЯК АБІТУРЫЕНТЫ БДУІР ПАЎДЗЕЛЬНІЧАЛІ Ў РЭАЛІЦІ-ШОУ

**«У апошні час з галавы не выходзіць думка пра тое, як зменіцца маё жыццё, калі я стану студэнткай БДУІР. Гэта штосьці невядомае і незразумелае для мяне. Дзякуючы гэтаму праекту ў мяне ёсць шанц нарэшце паглядзець свайму страху ў вочы, акунуцца з галавой у студэнцкае жыццё і развеяць усе сумненні наконт паступлення ва ўпадабаную ВНУ», — напісала ў сваёй заяўцы на ўдзел у праекце «#Я ў БДУІР: стань студэнтам на адзін дзень» вучаніца выпускнога класа жодзінскай сярэдняй школы №5 Алена Войтава.**



Абітурыенты ў лабараторыі CISCO.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### Крэатыў вітаецца...

Днямі ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі завіталі 25 вучняў сталічных школ, якім прадставілася ўнікальная магчымасць прымераць на сябе ролю студэнта: пабываць на лекцыях, у вучэбна-навуковых лабараторыях і цэнтрах, зазірнуць у бібліятэку, падсілкавацца ў студэнцкай сталоўцы, ацаніць спартыўныя аб'екты ўніверсітэта, пазнаёміцца бліжэй з магчымасцямі для баўлення студэнтамі часу па-за вучобай і ўласнага развіцця...

Удзельнікамі праекта сталі адзінаццацікласнікі, якія выклалі фота з Дня адкрытых дзвярэй у Instagram і даслалі свае заяўкі, дзе ў крэатыўнай форме (у тым ліку і ў вершаванай) патлумачылі, чаму менавіта яны павінны стаць студэнтамі на адзін дзень. Усяго адгукнулася каля 100 выпускнікоў з усёй краіны. З іх адабралі 50 чалавек і падзялілі на дзве групы. Кожнай групе адвялі свой дзень. Акрамя асноўнай праграмы, для іншагародніх удзельнікаў прадугледзелі яшчэ і экскурсію ў студэнцкі інтэрнат, бо для іх паступленне — толькі палова задачы. Не менш важна і, напэўна, страшна адарвацца ад бацькоў і наладзіць самастойнае жыццё ў інтэрнаце...

Да старту прыёмнай кампаніі ў краіне застаюцца лічаныя тыдні. Многае вырашаецца ўжо на этапе рэгістрацыі на цэнтралізаванае тэсціраванне, калі маладыя людзі вызначаюцца з пералікам экзаменацыйных дысцыплін. Таму канкурэнцыя паміж ВНУ за абітурыентаў рэзка абвастраецца...

### Ад мары — да яе здзяйснення

— У лютым у Мінску прайшла традыцыйная выстава «Адукацыя і кар'ера», на якой вельмі сур'ёзна былі прадстаўлены ВНУ іншых краін: Польшчы, Чэхіі, Літвы, Латвіі... А Расія павялічыла свае выставачныя плошчы ўдвая... І ўсе вельмі цікава і нестандартна працавалі на прыцягненне нашых выпускнікоў, — мусіў канстатаваць **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — Таму мы палічылі, што нам трэба адваяваць сваю элітную моладзь. Вось і задумалі цэлы шэраг новых прафарыентацыйных мерапрыемстваў, у тым ліку і праект «Стань студэнтам на адзін дзень».

Між іншым, чацвёра ўдзельнікаў (два хлопцы і дзве дзяўчыны з Мінска і рэгіёнаў, якіх абралі ў сацыяльных сетках з дапамогай генератара выпадковых лікаў) сталі яшчэ і героямі рэаліці-шоу, якое здымала Маладзёжнае тэлебачанне БДУІР. Іх паўсюль суправаджалі камеры: задачай навaспечаных «тэлезорак» было падзяліцца сваімі эмоцыямі і ўражаннямі ад пачутага і ўбачанага. Пазней з відэаматэрыялу будзе зманціраваны відэаролік — своеасаблівая візітоўка для БДУІР.

А мы тым часам вырашылі пацікавіцца ў гасцей БДУІР іх жыццёвымі і прафесійнымі планамі.


Уладзіслаў ШУЛЬЖЫЦКІ, Вікторыя КОЛЕСЕНЬ і Генадзь БАРАДУН: «Мы не канкурэнты...».

**Адзінаццацікласнік 191-й сталічнай школы Генадзь БАРАДУН** шчыра прызнаўся, што яшчэ зусім нядаўна звязваў сваю будучыню з іншай ВНУ, але цяпер усур'ёз задумаўся над паступленнем у БДУІР. Засталося толькі вызначыцца з факультэтам і спецыяльнасцю.

— Канешне, было б класна паступіць на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак, але я цвяроза і крытычна ацэньваю свае шанцы. Для мяне гэта суперзадача! Трэба вельмі сябраваць з фізікай, каб замахнуцца на спецыяльнасці з самымі высокімі прахаднымі баламі не толькі ў гэтым універсітэце, але і ва ўсёй краіне. Сёння мы наведалі шэраг факультэтаў, у тым ліку і факультэт камп'ютарнага праектавання, дзе нам расказалі пра спецыяльнасць «сістэмы бяспекі». Зацікавіў мяне і факультэт тэлекамунікацый. Мяркую, што паміж імі і буду выбіраць...

**Вучаніца Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя Вікторыя КОЛЕСЕНЬ** даведалася пра праект яшчэ на Дні адкрытых дзвярэй: «Мне стала цікава. Я рэдка ўдзельнічаю ў нейкіх праектах і мала дзе выйграю. А тут вырашыла паспрабаваць, хоць асабліва ні на што не спадзявалася... У мяне сумненняў няма: планую паступаць у БДУІР на інжынерна-эканамічны факультэт на спецыяльнасць «электронны маркетынг» . Першапачаткова лічыла, што я — эканаміст у чыстым выглядзе, таму думала пра Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Але ў 11- м класе мяне зацікавіў БДУІР. Праграмісты заўсёды патрэбныя, але ў маім выпадку размова ідзе не проста пра праграміста, а пра спалучэнне двух спецыяльнасцяў: праграміст і маркетолаг. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя маркетолаг-праграміст. Лічу, што гэта вельмі перспектыўная спецыяльнасць... Разумею, што і прахадныя балы тут высокія, і што вучыцца ў тэхнічнай ВНУ будзе складана. Але студэнты з гэтага факультэта мяне заспакоілі: вучоба — цікавая. А гэта, напэўна, для мяне галоўнае...

Дарэчы, ні Вікторыя, ні яшчэ адзін **выпускнік Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя Уладзіслаў ШУЛЬЖЫЦКІ** да паслуг рэпетытараў не прыбягаюць. Кажуць, што ведаў, якія ім даюць у ліцэі, павінна хапіць для паступлення нават на самыя прэстыжныя спецыяльнасці.

— Я звязаны з камп'ютарамі з чацвёртага класа. І ў пятым ужо быў упэўнены, што займуся чымсьці тэхнічным, — кажа Уладзіслаў. — У шостым і сёмым класе вырашыў, што буду вучыцца ў БДУІР. Далей стаў вагацца: можа, паехаць у Польшчу, у тэхнічны ўніверсітэт? Але пасля гутаркі з выпускнікамі ўніверсітэта зрабіў выбар на карысць БДУІР. У 10-м класе вызначыўся і з факультэтам (гэта ФКСіС), і са спецыяльнасцю («праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій»). Цэнтралізаванага тэсціравання не баюся. Зараз актыўна займаюся самападрыхтоўкай, каб добра здаць экзамены. Між іншым, сёння мы прысутнічалі на лекцыі па імітацыйным мадэляванні: было вельмі складана, але цікава. Ці ёсць у мяне падстраховачныя варыянты? Хіба што спецыяльнасць «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» на ФКСіСе... Цікавым мне падаўся і факультэт камп'ютарнага праектавання. Таму, калі штосьці не атрымаецца з першым варыянтам, буду арыентавацца на яго.

У сваёй заяўцы на ўдзел у праекце Уладзіслаў напісаў: «Мне так хочацца на адзін дзень уявіць сябе УЖО студэнтам гэтай ВНУ, пражыць гэты дзень клопатамі студэнта, акунуцца ў студэнцкае асяроддзе і зарадзіцца станоўчай энергіяй для рэальнага і ўдачнага паступлення у БДУІР! Я заўсёды веру ў сябе і сваю ўдачу».

### Ніхто не застанецца па-за бортам

Апошнім пунктам для ўдзельнікаў праекта стала сустрэча з рэктарам БДУІР, прафесарам Міхаілам Батурам, які заклікаў іх не ленавацца і пры падачы заяў указваць у якасці прыярытэтных як мага большую колькасць спецыяльнасцяў.

— Аўтаматызаваная сістэма, якая дзейнічае ў БДУІР ужо некалькі гадоў, дазваляе карэктаваць залічэнне ў студэнты ў залежнасці ад расстаноўкі абітурыентамі прыярытэтаў і наяўнасці незапоўненых месцаў на тых ці іншых спецыяльнасцях, — патлумачыў ён. — У парадку ўбывання прыярытэтаў абітурыент можа пазначыць усе спецыяльнасці тэхніка-тэхналагічнага профілю. Такім чынам, шанцы застацца за бортам у абітурыентаў БДУІР мінімальныя, калі, вядома, яны не ўказалі ў сваім рэйтынгу толькі адну ці дзве спецыяльнасці.

Дарэчы, летась у БДУІР з'явілася новая спецыяльнасць «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў гульнявой індустрыі», на якой былі прадугледжаны толькі платныя месцы. А сёлета тут будзе ажыццяўляцца набор і на 10 бюджэтных месцаў. Плюс яшчэ 50 абітурыентаў змогуць вучыцца на праграміста-геймдызайнера на платнай аснове.

— А ці ведаеце вы, што мы ўжо навучаем 46 грамадзян ЗША па дыстанцыйнай форме на дзвюх спецыяльнасцях? — пацікавіўся рэктар у юных гасцей.

— Не, не ведаем, — шчыра адказалі тыя.

— Значыць, вы яшчэ нічога не ведаеце пра наш універсітэт, — пажартаваў Міхаіл Батура і расказаў адзінаццацікласнікам пра студэнтаў універсітэта, якія гэтым летам у рамках праграмы Міжнароднай асацыяцыі па абмене студэнтамі для праходжання вытворчай практыкі IAESTE будуць адточваць свае прафесійныя навыкі ў іншых краінах, а на іх месца ў Беларусь на практыку прыедуць студэнты-іншаземцы. Пра ўдзел студэнтаў-праграмістаў з БДУІРа ў фінале сёлетняга чэмпіянату свету па праграмаванні, які пройдзе ў маі ў Тайландзе...

Падчас выдачы ўсім удзельнікам праекта сертыфікатаў Міхаіл Батура цікавіўся ў кожнага з іх, куды той збіраецца паступаць.

— Яшчэ не ведаеце? Думайце... Любы факультэт вас чакае. І прыводзьце з сабой сваіх найлепшых сяброў.

— Не лепшых за нас! — жартавалі ў адказ школьнікі.

— А вы не бойцеся канкурэнцыі. Месцаў хопіць усім, — паабяцаў, развітваючыся з адзінаццацікласнікамі Міхаіл Батура

■ Крэатыў

## Як стаць відэаблогерам?

**Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» запрашае падлеткаў і маладых людзей ва ўзросце ад 11 да 19 гадоў прыняць удзел у бясплатным дыстанцыйным электронным навучальным курсе «Школа блогера. Дайджэст для тынэйджараў».**

Задача праекта — заахвоціць маладых людзей здымаць цікавае відэа пра сябе, свой лад жыцця, а таксама пра актуальныя пытанні з жыцця грамадства.

Курс разлічаны на маладых людзей, якія толькі плануюць здымаць відэаролікі ці ўжо робяць першыя крокі ў гэтым кірунку. Навучанне будзе адбывацца ў інтэрнэце дыстанцыйна з 16 мая па 19 чэрвеня.

Ад удзельнікаў праекта патрабуецца заходзіць на партал дыстанцыйнага навучання Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА ў зручны для іх час, каб вывучыць прадстаўленыя там матэрыялы і выканаць практычныя заданні. Формула навучання — 25% тэорыі і 75% практыкі.

На працягу праекта неабходна будзе зняць як мінімум два ролікі: адзін — у працэсе навучання, а другі — у якасці выніковай работы.

Пасля заканчэння вучобы пройдзе конкурс на найлепшае відэа, удзельнікі якога атрымаюць дыпломы і падарункі ад Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ). Таксама самыя актыўныя падлеткі будуць запрошаны для доўгатэрміновага супрацоўніцтва з відэаканалам All Teens Can («Усе падлеткі могуць»).

Каб запісацца на міжнародны дыстанцыйны электронны курс, трэба пакінуць заяўку на партале дыстанцыйнага навучання РГА «БелАЮ» да 15 мая

■ Школьны расклад

## ФІЗІКА — З СЁМАГА КЛАСА

**Міністэрствам адукацыі зацверджаны новы тыпавы вучэбны план для сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі на 2016/2017 навучальны год.**

Як патлумачыла **прэс-сакратар Міністэрства адукацыі Юлія БАРАДУН,** у сувязі з пераходам на адносную завершанасць II ступені агульнай сярэдняй адукацыі і ўвядзеннем на III ступені школы профільнага навучання, тыпавы вучэбны план зацвярджаецца цяпер кожны год на адзін навучальны год.

Профільнае навучанне ў X-XI класах прадугледжвае вывучэнне асобных прадметаў на павышаным узроўні. У сувязі з гэтым у тыпавым вучэбным плане для навучэнцаў XI класаў (гэтак жа, як у бягучым навучальным годзе для вучняў X класаў) прадугледжана розная колькасць гадзін для вывучэння прадметаў на базавым і павышаным узроўнях.

У краіне зараз праходзіць паэтапны пераход на абноўленыя навучальныя праграмы па прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура», «Руская мова» і «Руская літаратура». Яны прадугледжваюць паступовае ўвядзенне аднолькавай колькасці гадзін на гэтыя прадметы ва ўсіх школах, гімназіях і ліцэях. У гэтай сувязі з наступнага навучальнага года будзе ўстаноўлена роўная колькасць гадзін на вывучэнне вышэйзгаданых прадметаў у другіх класах.

У 2016/2017 навучальным годзе для навучэнцаў II і VI класаў будзе ўведзены прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці». А з пераліку прадметаў для вучняў VI класаў быў выключаны вучэбны прадмет «Фізіка» (вывучаць яе школьнікі будуць цяпер толькі з VII класа).

З 2015/2016 навучальнага года распачалося выкладанне вучэбнага прадмета «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)» у пятых класах. Тыпавым вучэбным планам на 2016/2017 навучальны год прадугледжана далейшае вывучэнне гэтага вучэбнага прадмета школьнікамі ўжо ў шостых класах.

Абноўленая праграма прадугледжвае ў VI класе дзве гадзіны на прадмет «Працоўнае навучанне». У 2015/2016 навучальным годзе на адточванне працоўных навыкаў школьнікамі адводзілася адна гадзіна

Матэрыялы паласы падрыхтавала **Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

Страховая организация
**РДУСП «Стравита»**
Учетный номер плательщика: 806000046
Вид экономической деятельности: страхование жизни
Единица измерения: тыс. руб.
Адрес: 220037, г. Минск, пер. Козлова, 7

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 1 января 2016 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 40 401 386 | 39 301 438 |
| Нематериальные активы | 120 | 4 413 237 | 5 562 557 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | | |
| в том числе: инвестиционная недвижимость | 131 | | |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | | |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | | |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 4 360 080 | 208 800 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 520 612 607 | 212 704 688 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 160 | | 1 513 |
| Отложенные налоговые активы | 170 | | |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **1 569 787 310** | **257 778 996** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 2 065 699 | 1 692 733 |
| в том числе: материалы | 211 | 2 065 699 | 1 692 733 |
| незавершенное производство | 212 | | |
| прочие запасы | 213 | | |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 215 | | |
| Расходы будущих периодов | 220 | 420 466 | 386 413 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 230 | | |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 240 | | |
| в том числе: резерв незаработанной премии | 241 | | |
| резервы убытков | 242 | | |
| другие технические резервы | 243 | | |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 24 924 724 | 29 230 335 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | | 554 051 168 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 1 083 365 391 | 869 394 601 |
| в том числе: касса | 271 | | |
| депозитные счета | 272 | 1 080 836 614 | 857 807 208 |
| эквиваленты денежных средств | 273 | | |
| прочие денежные средства | 274 | 2 528 777 | 11 587 393 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | | |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **1 110 776 280** | **1 454 755 250** |
| **БАЛАНС** | **300** | **2 680 563 590** | **1 712 534 246** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 1 января 2016 года | На 31 декабря 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 150 985 394 | 103 615 441 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | – | – |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | – | – |
| Резервный капитал | 440 | 5 489 485 | 8 709 904 |
| в том числе резервный фонд заработной платы | 441 | 5 472 657 | 5 299 921 |
| Добавочный капитал | 450 | 47 457 670 | 42 733 783 |
| в том числе прирост (переоценка) стоимости объектов недвижимости, приобретенных за счет страховых резервов | 451 | – | – |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 63 945 432 | 45 790 159 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | – | – |
| Целевое финансирование | 480 | – | – |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **267 877 981** | **200 849 287** |
| **IV. СТРАХОВЫЕ РЕЗЕРВЫ И ФОНДЫ** | | | |
| Резервы по видам страхования, относящимся к страхованию жизни | 500 | 2 368 149 026 | 1 507 702 718 |
| Резерв незаработанной премии | 501 | – | – |
| Резервы убытков | 502 | – | – |
| Другие технические резервы | 503 | – | – |
| Иные страховые резервы | 504 | – | – |
| Фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 505 | 223 075 | 95 207 |
| Гарантийные фонды | 506 | 537 488 | 318 319 |
| Иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 507 | – | – |
| **ИТОГО по разделу IV** | **509** | **2 368 909 589** | **1 508 116 244** |
| **V. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | – | – |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | – | – |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 540 | – | – |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | – | – |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | – | 1 513 |
| **ИТОГО по разделу V** | **590** | **–** | **1 513** |
| **VI. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | – | – |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | – | – |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 9 776 020 | 3 567 202 |
| в том числе: страхователям | 631 | 2 242 647 | 661 434 |
| страховым агентам и страховым брокерам | 632 | 1 593 462 | 752 722 |
| прочим кредиторам по операциям страхования, сострахования | 633 | – | – |
| по операциям перестрахования | 634 | – | – |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 635 | – | – |
| поставщикам и подрядчикам | 636 | 431 461 | 381 500 |
| по авансам полученным | 637 | – | – |
| по налогам и сборам | 638 | 145 574 | 236 153 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 639 | 375 366 | 222 546 |
| по оплате труда | 640 | 1 202 568 | 574 728 |
| по лизинговым платежам | 641 | – | – |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 642 | – | – |
| прочим кредиторам | 643 | 3 784 942 | 738 119 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 650 | – | – |
| Доходы будущих периодов | 660 | 34 000 000 | – |
| Резервы предстоящих платежей | 670 | – | – |
| Прочие краткосрочные обязательства | 680 | – | – |
| **ИТОГО по разделу VI** | **690** | **43 776 020** | **3 567 202** |
| БАЛАНС | 700 | 2 680 563 590 | 1 712 534 246 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2015 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь-декабрь 2015 года | За январь-декабрь 2014 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ, ОТНОСЯЩЕМУСЯ К СТРАХОВАНИЮ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто | 010 | 509 640 933 | 352 450 329 |
| Страховые выплаты | 020 | 221 975 250 | 103 592 206 |
| Изменение резервов по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (+ или -) | 030 | (860 446 308) | (791 978 512) |
| в том числе изменение резерва дополнительных выплат | 031 | (375 185 983) | (488 364 539) |
| Отчисления в гарантийный фонд и фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 040 | 6 908 161 | 4 486 304 |
| Расходы на ведение дела | 050 | 68 534 167 | 46 479 766 |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 055 | 682 516 | 421 712 160 |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием, относящимся к страхованию жизни | 056 | 70 084 | 19 057 758 |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования, относящимся к страхованию жизни** (строки 010 - 020 + (030 - 031) - 040 - 050 + 055 - 056) | 060 | (272 424 538) | 296 932 482 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 065 | 13 862 | 779 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 066 | 10 129 158 | 7 491 924 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности по видам страхования, относящимся к страхованию жизни (строки ± 060 + 065 - 066) | 069 | (282 539 834) | 289 441 337 |
| **ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО СТРАХОВАНИЮ ИНОМУ, ЧЕМ СТРАХОВАНИЕ ЖИЗНИ** | | | |
| Страховые взносы (страховые премии), брутто – всего | 070 | – | – |
| в том числе: по прямому страхованию и сострахованию | 071 | – | – |
| по рискам, принятым в перестрахование | 072 | – | – |
| Страховые премии по рискам, переданным в перестрахование, брутто | 073 | – | – |
| Страховые взносы (страховые премии) с учетом перестрахования, нетто (строки 070 - 073) | 074 | – | – |
| Изменение резерва незаработанной премии, брутто | 080 | – | – |
| Изменение доли перестраховщиков в резерве незаработанной премии | 081 | – | – |
| Изменение резерва незаработанной премии с учетом перестрахования, нетто (итог строк 080 и 081) | 082 | – | – |
| Заработанные премии, нетто (итог строк 074 и 082) | 085 | – | – |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты), брутто | 090 | – | – |
| Доля перестраховщиков в убытках (страховых выплатах) | 091 | – | – |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) с учетом перестрахования, нетто (строки 090 - 091) | 092 | – | – |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат), брутто | 095 | – | – |
| Изменение доли перестраховщиков в резервах убытков (страховых выплат) | 096 | – | – |
| Изменение резервов убытков (страховых выплат) с у четом перестрахования, нетто (итог строк 095 и 096) | 097 | – | – |
| Заработанные премии за вычетом страховых убытков (страховых выплат) (строки 085 - 092 + 097) | 100 | – | – |
| Изменение других технических резервов | 110 | – | – |
| Изменение иных страховых резервов | 120 | – | – |
| в том числе увеличение специального страхового резерва по обязательному страхованию с государственной поддержкой урожая сельскохозяйственных культур, скота и птицы за счет дохода, полученного от инвестирования этого резерва | 121 | – | – |
| Отчисления в фонды предупредительных мероприятий и гарантийные фонды | 130 | – | – |
| Отчисления в иные фонды, образованные в соответствии с законодательством | 140 | – | – |
| Расходы на ведение дела, всего | 150 | – | – |
| в том числе: комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 151 | – | – |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 155 | – | – |
| Доходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 160 | – | – |
| Расходы по деятельности, связанной со страхованием иным, чем страхование жизни | 165 | – | – |
| **Прибыль (убыток) от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни** (строки 100 + 110 + (120 – 121) – 130 – 140 – 150 + 155 + 160 – 165) | 170 | – | – |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 175 | – | – |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 176 | – | – |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности по видам страхования иным, чем страхование жизни** (строки ± 170 + 175 - 176) | 179 | – | – |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 180 | 8 306 082 695 | 1 887 347 071 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 181 | – | – |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 182 | 53 592 | 35 728 |
| проценты к получению | 183 | 228 620 027 | 210 456 163 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 184 | 8 077 409 076 | 1 676 855 180 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 190 | 7 785 539 899 | 1 554 666 892 |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 191 | 5 661 | 120 |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 192 | 7 785 534 238 | 1 554 666 772 |
| Доходы по финансовой деятельности | 200 | 212 708 341 | 24 817 014 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 201 | 212 708 341 | 24 817 014 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 202 | – | – |
| Расходы по финансовой деятельности | 210 | 52 044 749 | 2 713 603 |
| в том числе: проценты к уплате | 211 | – | – |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 212 | 52 044 749 | 2 713 603 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 213 | – | – |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (строки 180 – 190 + 200 – 210) | 220 | 681 206 388 | 354 783 590 |
| в том числе доход от инвестирования специального страхового резерва по обязательному страхованию с государственной поддержкой урожая сельскохозяйственных культур, скота и птицы, направленный на увеличение этого резерва | 230 | – | – |
| **Прибыль (убыток) до налогообложения** (строки ± 069 ± 179 ± 220 – 230 + 031) | 240 | 23 480 571 | 155 860 388 |
| Налог на прибыль | 250 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых активов | 260 | – | – |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 270 | – | – |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 280 | – | – |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 285 | – | – |
| **Чистая прибыль (убыток) (строки ± 240 – 250 ± 260 ± 270 – 280 – 285)** | 290 | 23 480 571 | 155 860 388 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 300 | 1 405 180 | 2 911 401 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 310 | – | – |
| Совокупная прибыль (убыток) (строки ± 290 ± 300 ± 310) | 320 | 24 885 751 | 158 771 789 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 330 | – | – |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 340 | – | – |

**Руководитель** **А.В. Сакович**

**Зам. главного бухгалтера** **И.Е. Валаханович**

**Годовая бухгалтерская отчетность размещена на сайте РДУСП «Стравита» на странице www.stravita.by/ru/buh_otchet/.**

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ ПО БУХГАЛТЕРСКОЙ ОТЧЕТНОСТИ
## Республиканского дочернего унитарного страхового предприятия «Стравита»
### за период с 01.01.2015 г. по 31.12.2015 г.

*Директору Моисеенко Виктору Федоровичу*

*Реквизиты аудируемого лица:*

Наименование организации: Республиканское дочернее унитарное страховое предприятие «Стравита»
Местонахождение: 220037 г. Минск, пер. Козлова, д. 7
Сведения о государственной регистрации:
дата государственной регистрации 01.03.2002 г.
регистрационный номер в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 806000046.

*Реквизиты аудиторской организации:*

Наименование аудиторской организации: Частное аудиторское унитарное предприятие «Аудит-конто»
Местонахождение: 220004 г. Минск, ул. Сухая, д. 3, каб. 504

*Сведения о государственной регистрации:*

дата государственной регистрации 01.02.2007 г.
регистрационный номер в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190799512.

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской отчетности РДУСП «Стравита», состоящей из бухгалтерского баланса на 31 декабря 2015 г., отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, а также примечаний к бухгалтерской отчетности.

*Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке бухгалтерской отчетности*

Руководство РДУСП «Стравита» несет ответственность за составление и представление бухгалтерской отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь и организацию системы внутреннего контроля, необходимой для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, допущенных вследствие недобросовестных действий или ошибок.

*Обязанности аудиторской организации*

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь от 12 июля 2013 года «Об аудиторской деятельности» и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей бухгалтерской отчетности РДУСП «Стравита», а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля РДУСП «Стравита», необходимая для составления бухгалтерской отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы.

Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания бухгалтерской отчетности РДУСП «Стравита».

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

*Аудиторское мнение*

По нашему мнению, бухгалтерская отчетность РДУСП «Стравита» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение РДУСП «Стравита» на 31.12.2015 г., а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения РДУСП «Стравита» за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь.

*Прочие вопросы*

Аудит бухгалтерской отчетности РДУСП «Стравита» за период с 1 января по 31 декабря 2014 г. включительно был проведен аудитором – индивидуальным предпринимателем Ткач Светланой Ивановной, аудиторское заключение которой датировано 26 февраля 2015 г. и содержит аудиторское мнение без оговорок.

Директор
Частного предприятия «Аудит-конто» Гапанович А.Г.
Руководитель аудиторской группы Кривошеев А.В.

Дата подписания аудиторского заключения по бухгалтерской отчетности 25 февраля 2016 г.

---

П Р И Г Л А Ш Е Н И Е

**Унитарное предприятие Национального олимпийского комитета Республики Беларусь «Спортивно-оздоровительный комплекс «ОЛИМПИЙСКИЙ»**

## проводит аукцион № 99 по продаже права заключения договора аренды изолированного нежилого помещения сроком на три года

| | Предмет аукциона (право заключения договора аренды), цель использования помещения | Площадь, м² | Начальная цена продажи |
|---|---|---|---|
| | **г. Минск ул. Сурганова, 2** | | |
| 1 | Изолированное нежилое помещение № 47 на 1 этаже (под офис) | 12,7 | 431 800 |

**Аукцион состоится «24» мая 2016 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 2а, конференц-зал. Документы на участие принимаются по «23» мая 2016 года до 17.00 включительно по адресу: 220012, г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются. Телефоны для справок: (017) 290-49-06, 290-47-18, 290-49-11.

Интернет: www.dvs.by.

**Организатор аукциона (продавец) – УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ», г. Минск, ул. Сурганова, 2а, пом. 2, к. 40.**

Для участия в аукционе участник перечисляет задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота на **расчетный счет 3012208250015, ОАО «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, МФО 153001964, УНП 101 508 270, УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом на расчетный счет организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.

Победитель аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан возместить УП «СОК «ОЛИМПИЙСКИЙ» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) приобретает право заключения договора аренды после оплаты стоимости предмета аукциона и возмещения затрат на организацию и проведение аукциона.

---

## Извещение о проведении повторных аукционных торгов по продаже имущества, обращенного в доход государства

| № лота | 1 |
|---|---|
| **Наименование объекта** | Земельный участок с кадастровым номером 120488702101000167 площадью 0,1720 га и расположенное на нем капитальное строение с инвентарным номером 110/С-99909 (одноэтажный деревянный жилой дом с холодной пристройкой, погребней с бетонным погребом, уборной) площадью 38,9 кв.м |
| **Местонахождение объекта** | Брестская область, Барановичский р-н, Крошинский с/с, д. Петковичи, ул. Встречная, 59Б |
| **Начальная цена продажи** | **33 181 000 руб.** |
| **Сумма задатка** | 3 318 000 руб. |

**Аукцион состоится 12 мая 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 25.04.2016 г. до 17.30 04.05.2016 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Указом Президента РБ от 04.09.2006 №559.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».

**При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, предоставляет:**

- копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
- документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт;
- паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенную доверенность для представителя физического лица;
- заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающие внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта;
- организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе);
- организациями и физическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на бел. (рус.) язык;
- представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100, Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:

- **в течение 3 рабочих дней** с даты проведения торгов оплатить сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников;
- в течение 2 месяцев и 25 дней с даты проведения торгов и подписания протокола о результатах аукциона осуществить оплату за предмет аукциона. Право собственности на приобретенный на аукционе объект недвижимости, обращенный в доход государства, регистрируется в соответствии с законодательством.

**Победителю аукциона для обслуживания приобретенного объекта отвод земельного участка будет осуществлен в установленном законодательством порядке.**

**Контактные телефоны: 53-81-92, 53-45-65. Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

---

25 лет белагропромбанк

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 25 апреля 2016 года по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Линия роста 3.0. Свыше года» в долларах США и евро, заключенным в период с 01.04.2016 по 24.04.2016, размер процентной ставки в зависимости от срока размещения составит: 370 дней – 3,9% годовых, 735 дней – 4,0% годовых.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

25 лет белагропромбанк

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что с 25 апреля 2016 года размер процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Стандарт» в долларах США и евро с переменной процентной ставкой, заключенным в период с 04.03.2016 по 24.04.2016, будет составлять: на срок 95 дней – 4,0% годовых, 185 дней – 4,5% годовых, 370 дней – 4,9% годовых.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

**Цімафей АКУДОВІЧ:**

# «ЦЯПЕР ЛЮДЗІ ХОДЗЯЦЬ НА ЭКСКУРСІІ І РАЗУМЕЮЦЬ, ШТО ГЭТА НОРМА»



**Радуйцеся, аматары гісторыі і нетрывіяльных экскурсійных вандровак: любімы многімі «Фэст экскурсаводаў» пройдзе ў Беларусі ў гэтыя выхадныя ўжо сёмы раз. Толькі ў Мінску плануецца каля ста бясплатных экскурсій па самых разнастайных тэмах і маршрутах, апроч таго дзясяткі экскурсій правядуць ва ўсіх рэгіёнах краіны. Мерапрыемства прысвечана Міжнароднаму дню аховы помнікаў і мясцін (18 красавіка) і сёлета аб'яднае культуру і спорт, звяжа амерыканскі футбол і гістарычныя мясціны. Як гэта магчыма зрабіць, а таксама якіх вынікаў дасягнула ініцыятыва нераўнадушных гідаў, «Звяздзе» расказаў каардынатар «Фэсту экскурсаводаў» гісторык Цімафей АКУДОВІЧ.**



***— Паведамлялася, што сёлетні фэст пройдзе ў «якасна новым фармаце». Што гэта будзе за фармат?***

— Аснова класічная: мы прапаноўваем экскурсаводам і краязнаўцам правесці бясплатную экскурсію для ўсіх ахвотных па любых тэмах і раёнах, якія самі выберуць.

Адна з прынцыповых змен у тым, што мы паспрабавалі як мага больш экскурсій зрабіць пад запіс. Гэта вымушаная мера, бо мы ўжо не можам кантраляваць колькасць людзей. Таму робім анлайн-рэгістрацыю і рэгістрацыю па тэлефоне.

Кожны год мы выбіралі тэму фэсту, кіруючыся пастановамі Міжнароднага камітэта па помніках і мясцінах ICOMOS, які і зацвердзіў Міжнародны дзень помнікаў і мясцін. Былі гады, прысвечаныя помнікам індустрыяльнай культуры, адукацыі, палацам, паркам. Сёлета тэма даволі незвычайная: помнікі спорту. Для нас, экскурсаводаў, гэта своеасаблівы выклік. Бо цяпер у нас ёсць толькі адна афіцыйная экскурсія, звязаная са спортам, па праспекце Пераможцаў, і прысвечана яна не помнікам, а сучасным спартыўным будынкам. А вось спорт з пазіцыі мінулага ў нас мала хто разглядае. Таму мы паспрабуем зрабіць маршруты па гістарычных мясцінах, звязаных з ім.

Будзе экскурсія на трэніроўку мінскай каманды па амерыканскім футболе «Ліцвіны». Гэта даволі незвычайны від спорту для Беларусі, таму, думаю, будзе цікава паглядзець, як яны трэніруюцца і што гэта ўвогуле такое.

***— У той жа час спартыўная скіраванасць фэсту не адмяняе экскурсій на іншыя тэмы?***

— Так, іх большасць. Апроч тых, што былі летась, дадаліся новыя. Па-руску, па-беларуску, на замежных мовах, па Мінску, за горадам, па рэгіёнах, на веласіпедах, аўтамабілях... Па архітэктурных стылях, эпохах, асобах, прафесіях, вуліцах...

***— А якія з іх самыя «смачныя»?***

— У Барысаве будзе маршрут па скарбе Напалеона на Брылёўскім полі. У Мінску ўпершыню пройдзе экскурсія па Ляхаўцы (раён канцэртнай залы «Мінск». — **Аўт.**). На мінскім гарадзішчы на Нямізе паспрабуем правесці экскурсію з выкарыстаннем мультымедыя: пакажам выявы на месцы самога замчышча, калі атрымаецца. Будуць новыя цікавыя экскурсіі ў Гродне і Віцебску. У Мінску пройдзе шэраг новых экскурсій па вуліцах: упершыню ў гісторыі вядомы краязнаўца Вадзім Зелянкоў правядзе маршрут па вуліцы Маскоўскай.

Будуць экскурсіі амаль па ўсіх сталічных храмах. Таксама плануем сацыяльны кірунак: прывязём дзяцей з дзіцячых дамоў Мінскага раёна на экскурсіі ў сталіцу.

***— Пашкадуйце людзей, як жа паўсюль разарвацца?***

— На жаль, давядзецца выбіраць. Фэст — не камерцыйная структура і не ставіць задачай задаволіць усіх. Гэта магчымасць паказаць патэнцыял для правядзення экскурсій. Але мы чакаем, калі якая-небудзь камерцыйная ініцыятыва дадумаецца да гэтага і пачне вадзіць па такіх маршрутах за грошы.

***— Колькі наведвальнікаў «прайшло» праз фэст? Ці мяняецца іх стаўленне да гісторыі свайго краю?***

— За ўсе гады не скажу, але летась у Мінску на экскурсіі прыйшло больш за 2000 чалавек, а ў рэгіёнах каля тысячы. Колькасць наведвальнікаў расце кожны год. Калі мы толькі пачыналі, гэта было нешта новае, на першы фэст прыйшло каля 700 чалавек. Таму нават па колькасці можна меркаваць, што людзі разумеюць: не трэба ехаць далёка, каб паглядзець і даведацца пра нешта цікавае. Нават Мінск — гэта вялікая таямніца, якую трэба разгадваць і разгадваць, хоць напачатку было так: «Як? У родным горадзе пайсці на экскурсію? Я ж тут на працу хаджу, магу сам вам усё расказаць». Змена, хутчэй, у тым, што цяпер людзі ходзяць на экскурсіі і разумеюць, што гэта норма. І, як паказвае вопыт, у іх пачынаецца дзікі «голад»: бо яны «з'елі» толькі тры экскурсіі са ста, таму жаданне пабачыць і даведацца больш расце.

> **«Нават Мінск — гэта вялікая таямніца, якую трэба разгадваць і разгадваць, хоць напачатку было так: «Як? У родным горадзе пайсці на экскурсію? Я ж тут на працу хаджу, магу сам вам усё расказаць».**

***— Бясспрэчна, «Фэст экскурсаводаў» вельмі папулярны сярод наведвальнікаў. А ці ёсць ад яго карысць для развіцця турызму на рэспубліканскім і, магчыма, міжнародным узроўні?***

— Мне здаецца, што ёсць. Ужо другі год нас падтрымлівае Міністэрства спорту і турызму, і кожны раз фэст робіцца ўсё больш маштабным. Папершае, гэта ўнікальная з'ява, якую мы прыдумалі, такога няма нідзе. Па-другое, для многіх экскурсаводаў гэта першая спроба прафесійнага досведу, «вялікі пінок» у прафесію, які вельмі натхняе развівацца далей. Адсюль выйшла шмат маладых талковых гідаў. Фэст дае магчымасць бачыць новыя формы і тэмы правядзення экскурсій, бо, калі мы пачыналі, у Мінску было толькі тры ці чатыры афіцыйныя маршруты. Цяпер сітуацыя іншая, пешаходныя экскурсіі па сталіцы водзяць і прыватныя гіды, і многія фірмы выкарыстоўваюць гэта як брэнд. Напрыклад, «Аліварыя» праводзіць экскурсіі, дзе расказваюць пра ўладальніка бровара Яна Караля Чапскага, кампанія «Velcom» ладзіла велаэкскурсію... Мне здаецца, у гэтым ёсць і кавалачак нашай заслугі.

***— У рамках фэсту гіды працуюць і на замежных мовах. Ці даведваюцца пра такія маршруты замежнікі?***

— З гэтым цяжэй. Мы стараемся, дасылаем інфармацыю ў пасольствы, спрабуем дагрукацца да носьбітаў мовы. І звычайна на іншамоўныя экскурсіі прыходзяць тры-чатыры-пяць замежнікаў.

Хоць першапачаткова фэст распрацоўваўся для ўнутранага рынку, нам важна было «падняць» жыхароў Беларусі, каб яны пачалі хадзіць, ездзіць па сваёй краіне. Гэтая мэта ў нас і застаецца.

***— Як можна трапіць на экскурсіі?***

— Сачыць за наяўнасцю вольных месцаў і запісвацца можна на старонцы http://guides.by/fest/.

«Фэст экскурсаводаў» — сапраўды знакавая падзея. Ужо ў першы дзень анлайн-рэгістрацыі на маршруты па Мінску не засталося вольных месцаў, паводле апошніх звестак па краіне на экскурсіі запісалася каля трох тысяч чалавек. Але яшчэ можна паспрабаваць шчасця: кожны дзень у спісе з'яўляецца некалькі дадатковых экскурсій, да таго ж адмяняюцца папярэднія запісы. Больш шанцаў трапіць на экскурсіі ў рэгіёнах, дзе іх каля 70. Апроч таго, сёлета ў межах фестывалю пройдуць экскурсіі ў Вільні і Маскве.

— Падчас фэсту з'яўляюцца новыя, унікальныя формы правядзення экскурсій. Дзякуючы яму некалькі гадоў таму з'явіліся веласіпедныя экскурсіі, і ў апошнія гады яны набываюць усё большы размах. Менавіта на фэсце з'явіліся экскурсіі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі — унікальны выпадак не толькі ў Беларусі, але і ў краінах СНД, — адзначае **кансультант аддзела планавання і арганізацыі турысцкай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Марына МАСТАШОВА.**

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*

# ІЗУМРУДНАЕ БАГАЦЦЕ КРАІНЫ

## НЕВЯДОМАЯ ЗЯМЛЯ Ў ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ

Паняцце аб экалагічным турызме ўпершыню з'явілася ў 80-я гады мінулага стагоддзя. Яно мае на ўвазе адпачынак чалавека на прыродзе без нанясення экалагічнай шкоды. Пры гэтым чалавек адмаўляецца ад пэўных цывілізацыйных выгод на карысць яднання з флорай і фаўнай, духоўнага ўзбагачэння ад зносін з імі і падтрымкі традыцыйнай культуры мясцовых супольнасцяў. У Еўропе гэты кірунак сёння вельмі папулярны. Турыстаў усё больш прыцягвае прыгажосць некранутай прыроды, якой багатая і наша краіна. Па словах **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Наталлі МІНЧАНКА,** сёння ў Беларусі ёсць 1275 прыродных комплексаў: запаведнікаў, паркаў, заказнікаў і помнікаў прыроды. А гэта амаль 8,8% ад усёй тэрыторыі нашай краіны. У Беларусі размешчаны чатыры нацыянальныя паркі і два запаведнікі, дзе захоўваюцца ўнікальныя ландшафты і існуюць рэдкія віды жывёл і раслін. Нам ёсць што прапанаваць нават самаму пераборліваму падарожніку: магчымасць спусціцца на байдарцы па рацэ, ажыццявіць пешы пераход па лясах, дзе можна ўбачыць шматвяковыя дрэвы і іншыя прыродныя артэфакты. Толькі ў нашай краіне можна паназіраць у дзікай прыродзе за царом лесу — зубрам. У Белавежскай пушчы турысты могуць прайсці па эксклюзіўным пешым маршруце «Пушчанскія рабінзоны», а ў ваколіцах Браслава — бясконца любавацца «каралямі» з вялікіх і маленькіх ледніковых азёр. Аднак пры гэтым наш турыстычны патэнцыял, паводле ацэнак спецыялістаў, усё яшчэ не раскрыты да канца. Вось і атрымліваецца, што Беларусь, нягледзячы на тое, што знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, да гэтага часу з'яўляецца «terra incognita» для большасці еўрапейцаў. Разам з тым, аналізуючы сітуацыю ў свеце, Міністэрства турызму краіны прыйшло да высновы, што сёння мы з'яўляемся бяспечным «востравам спакою» для вандроўнікаў і цяпер самы час задумацца пра тое, як развіваць гэты кірунак і прэзентаваць нашы магчымасці.

## ПАТРЭБНА АДЗІНАЯ СТРАТЭГІЯ

Калі гаворка ідзе аб захаванні біялагічнай разнастайнасці і турызме адначасова, на першы погляд можна вырашыць, што гэта ўзаемавыключальныя паняцці. Многія эксперты, якія праводзілі аналіз пытанняў захавання біясферы, прыходзілі да адзінай высновы, што, каб эфектыўна захоўваць біялагічную і ландшафтную разнастайнасць, неабходна ствараць сістэмы асабліва ахоўных прыродных тэрыторый (ААПТ). Аднак пры гэтым ва ўсім свеце адыходзяць ад татальнай забароны на выкарыстанне ААПТ для экалагічнага турызму. З'явілася такое паняцце, як «устойлівае выкарыстанне прыродных комплексаў і ААПТ». Важны элемент развіцця гэтага працэсу — укараненне экалагічнага турызму.

У нашай краіне, як і ва ўсім свеце, пад такім турызмам разумеюць прыцягненне ўвагі насельніцтва да захавання прыроды праз экаасвету. Гэты кірунак знайшоў свой працяг у зацверджанай «Нацыянальнай стратэгіі развіцця сістэмы ААПТ». Паводле згаданага дакумента вызначана 39 тэрыторый, на якіх плануецца развіваць экалагічны турызм.

Як адзначае Наталля Мінчанка, менавіта для іх створаны дзяржаўныя прыродаахоўныя ўстановы — тыя арганізацыі, якія могуць прасоўваць развіццё экатурызму. За кошт іх плануецца пашырыць магчымасці гэтага кірунку турызму ў Беларусі і далучыць да яго больш лакальныя праекты. Такімі з'яўляюцца, напрыклад, заказнікі «Налібоцкая пушча», «Спораўскі», «Чырвоны бор». Усяго прыродаахоўных устаноў сёння ў Беларусі 24, і яны кіруюць 26-цю заказнікамі. Аднак, паводле ацэнкі спецыяліста, яны не раскрываюць увесь свой патэнцыял.

Каб дапамагчы развіццю галіны, у Мінпрыроды распрацоўвалі фінансаванне ў рамках дзяржаўнай праграмы развіцця сістэмы ААПТ і дзяржпраграмы па развіцці турызму. Але Наталля Мінчанка падкрэсліла, што ўсе гэтыя мерапрыемствы ўсё яшчэ «кропкавыя». У Беларусі няма агульнай сістэмы па рэалізацыі такіх праектаў, а таксама дакладнага бачання таго, як павінен развівацца экатурызм. Важнай праблемай, на думку спецыяліста, з'яўляецца і адсутнасць інфармацыйных рэсурсаў, якія дазваляюць сабраць усе неабходныя звесткі для спажыўца.

У сувязі з гэтым сумесна са спецыялістамі ААН **у Беларусі збіраюцца стварыць нацыянальную стратэгію па развіцці экатурызму.** Плануецца, што гэта будзе з аднаго боку пакрокавы план дзеянняў, а з другога — дакумент, які дазволіць прыцягнуць інвестыцыі для развіцця кірунку. Дарэчы, інвестыцыйны складнік у падобных праектах з'яўляецца ключавым, зыходзячы з вопыту Еўрасаюза. Чакаецца, што сёлета ў чэрвені гэты дакумент будзе выстаўлены на шырокае грамадскае абмеркаванне.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## РАЗВІЦЦЁ ЗА КОШТ ДАПАМОГІ

Спроба стварыць стратэгію па развіцці экатурызму ў Беларусі была зроблена яшчэ ў 2004 годзе. Але яна не прынесла патрэбнага эфекту. Па ацэнцы **дацэнта кафедры кіравання турызмам БДЭУ Аляксандра ТАРАСЁНКА,** экалагічны турызм зараз развіваецца стыхійна. На тое ёсць свае прычыны: недахоп фінансавання, недастатковая кампетэнтнасць кадраў, праблема менеджменту.

Аднак, нягледзячы на гэта, дзякуючы міжнароднай тэхнічнай дапамозе па садзейнічанні пераходу Беларусі да «зялёнай» эканомікі, якая фінансуецца Праграмай развіцця ААН, у краіне гэты кірунак прасоўваецца. У рэспубліканскіх заказніках «Прыбужскае Палессе» і «Свіцязянскі» збіраюцца адкрыць эколага-інфармацыйныя цэнтры, пабудаваць інфраструктуру, пракласці экалагічныя сцежкі і пусціць экатранспарт. Рамонт у «Прыбужскім Палессі» ўжо практычна завершаны. У заказніку «Свіцязянскі» цяпер афармляецца тэрыторыя. Турызм тут будзе магчымы не толькі ўлетку, але і зімой. Вельмі цікавымі праектамі абяцаюць быць Цэнтр міфалагічнага турызму ў складзе «Музея міфічных істот», экалагічнай сцежкі «У краіне міфаў» і экспазіцыі пад адкрытым небам «Міфалагічны хутарок» у Бярэзінскім біясферным запаведніку, якія пабудуюць у найбліжэйшыя паўтара года.

Валютно-обменные операции оформляются в соответствии с нормативно-правовыми документами Национального банка Республики Беларусь.

Расчет суммы процентного дохода в иностранной валюте производится с округлением до двух знаков после запятой (целые числа – количество денежных единиц, десятичные – разменная монета соответствующего государства). Округление осуществляется с учетом четырех знаков после запятой по следующим правилам:

- если четвертая цифра после запятой больше или равна 5, то третья цифра после запятой увеличивается на единицу;

- если четвертая цифра после запятой меньше 5, то она отбрасывается;

- таким же образом осуществляется округление до сотых с учетом третьей цифры после запятой.

Выплата процентного дохода осуществляется эмитентом, начиная со дня окончания соответствующего процентного периода. Процентный доход за последний процентный период и иные процентные доходы, не полученные владельцем облигации на момент погашения облигации, выплачиваются в день погашения данной облигации.

В случае предъявления облигации к досрочному погашению на условиях, изложенных в пункте 17 настоящего документа, сумма неполученного дохода рассчитывается по дату досрочного погашения облигации включительно.

Выплата части процентного дохода не производится.

При погашении облигаций уплата неполученных владельцем облигации процентных доходов отдельно от выплаты номинальной стоимости облигации не производится.

**17. Условия и порядок досрочного погашения облигаций:**

Облигация 37-го, 38-го и 39-го выпусков может быть предъявлена к досрочному погашению, но не ранее рабочего дня, следующего за днем истечения двадцати четырех месяцев со дня фактической продажи эмитентом. При этом предъявителю облигации соответствующего выпуска выплачивается ее номинальная стоимость и неполученный доход по дату досрочного погашения облигации включительно (в валюте номинала облигации).

При досрочном погашении облигации выплата части номинала облигации и/или части дохода не производится.

В период обращения облигаций эмитент может принять решение об аннулировании досрочно погашенных облигаций и/или облигаций, не размещенных эмитентом на момент принятия такого решения. В случае принятия такого решения эмитент в установленном порядке письменно уведомляет Республиканский орган о необходимости исключения из Государственного реестра ценных бумаг (аннулирования) соответствующего количества облигаций.

**18. Порядок и сроки погашения облигаций:**

Погашение облигаций начинается 30.04.2019 и осуществляется в отношении лиц, предъявивших эти облигации к погашению, независимо от сроков обращения владельца облигации.

При погашении облигаций владельцу возмещается номинальная стоимость облигации, а также уплачиваются все не полученные владельцем облигации процентные доходы в валюте номинала облигации наличными деньгами либо в безналичном порядке в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

Облигации погашаются при предъявлении оригинала облигации эмитенту.

При погашении облигации выплата части номинала облигации не производится.

В случае если дата погашения облигаций приходится на нерабочий день, то погашение осуществляется в ближайший следующий за нерабочим днем рабочий день.

**19. Условия и порядок приобретения облигаций эмитентом до даты начала погашения облигаций с возможностью их последующего обращения:**

Приобретение облигаций эмитентом до даты начала погашения облигаций с возможностью их последующего обращения осуществляться не будет.

**20. Условия и порядок возврата средств инвесторам в случае признания Республиканским органом выпуска облигаций недействительным:**

В случае признания Республиканским органом выпуска облигаций недействительным эмитент в месячный срок с даты признания выпуска облигаций недействительным информирует инвесторов и возвращает обратившимся к эмитенту инвесторам денежные средства, полученные в оплату размещенных облигаций, а также причитающийся процентный доход по таким облигациям, и письменно уведомляет Республиканский орган о возврате указанных средств инвесторам в полном объеме.

Денежные средства возвращаются независимо от сроков обращения собственника или иного законного владельца облигации к эмитенту.

**21. Основания, по которым эмиссия облигаций может быть признана несостоявшейся:**

Эмитентом не предусматривается возможность признания эмиссии облигаций несостоявшейся.

**22. Дата государственной регистрации выпуска облигаций и государственный номер выпуска облигаций:**

Облигации 37-го выпуска зарегистрированы в Республиканском органе 06 апреля 2016 г.

Государственный регистрационный номер 5-200-02-2735.

Облигации 38-го выпуска зарегистрированы в Республиканском органе 06 апреля 2016 г.

Государственный регистрационный номер 5-200-02-2736.

Облигации 39-го выпуска зарегистрированы в Республиканском органе 06 апреля 2016 г.

Государственный регистрационный номер 5-200-02-2737.

**23. Информация об обеспечении:**

Эмиссия облигаций осуществляется по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь в соответствии с подпунктом 1.8 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28.04.2006 №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг». Общий размер обязательств по облигациям эмитента не превышает 80 процентов нормативного капитала эмитента.

Эмиссия облигаций согласована Национальным банком Республики Беларусь, постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 15.03.2016 №129.

Председатель правления В.Д.Бабарико

Главный бухгалтер Т.М.Пивовар

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8
выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

**Уважаемые акционеры**
**открытого акционерного общества**
**«Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск»**

**04 мая 2016 года в 15.00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров.**
**Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.**

**Повестка дня собрания:**
1. О выплате дивидендов за 1 квартал 2016 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 27 апреля по 3 мая 2016 г. (с 8.30 до 17.30), либо 04 мая 2016 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66.

Регистрация участников собрания с 14.15 до 14.45 по месту проведения собрания.

Реестр владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 25 апреля 2016 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

***Наблюдательный совет.***

УНП 300000398



Трастбанк

*«Банк, основанный на доверии»*
**ЗАО «Трастбанк»**
220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 61 057 | 42 515 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 364 | 376 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 135 556 | 248 966 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 149 240 | 43 932 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 60 882 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 506 505 | 397 982 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 4 595 | 4 595 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 195 659 | 157 477 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 42 754 | 19 178 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 78 026 | 64 396 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 1 234 638 | 979 417 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | 47 708 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 42 261 | 1 292 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 709 133 | 598 896 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 57 471 | 54 514 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 13 429 | 14 348 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 822 294 | 716 758 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 255 194 | 138 557 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 26 825 | 26 695 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 118 941 | 86 509 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 11 384 | 10 898 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 412 344 | 262 659 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 1 234 638 | 979 417 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.04.2016 | 01.04.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 23 718 | 19 419 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 11 927 | 16 720 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 11 791 | 2 699 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 8 695 | 8 985 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 486 | 773 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 7 209 | 8 212 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 14 | 9 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 4 659 | 4 139 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 1 845 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 4 613 | 2 494 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 3 847 | 3 331 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 21 326 | 15 814 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 648 | 937 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 933 | 990 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 200 | 729 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 733 | 261 |

Председатель Правления В.М.Саксон

Главный бухгалтер Н.В.Бродик

Дата подписания «12» апреля 2016 г.

Финансовая отчетность размещена на сайте
**http://www.trustbank.by/about/financial-statements/quarter/2016/**

УНП 100789114. Лиц. №14 от 26.04.2013 г. НБ РБ


■ Раскажыце дзецям

# ШМАТАБЛІЧНАСЦЬ ГВАЛТУ



**Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Разуменне» заклікае прыкласці сумесныя намаганні для будаўніцтва рэгіянальнага цэнтра па абароне дзяцей ад гвалту.**

Такая прапанова была агучана на 6-й Міжнароднай канферэнцыі «Бяспечная Беларусь для дзяцей» з удзелам як беларускіх экспертаў, так і спецыялістаў з Расіі, Украіны, Літвы, ЗША. У рэзалюцыі канферэнцыі гаворыцца, напрыклад, і аб мэтазгоднасці пашырэння сеткі дружалюбных дзецям пакояў. Яны ўжо дзейнічаюць у некалькіх раёнах сталіцы, у тым ліку на базе Дзяржаўнай службы медыцынскіх судовых экспертыз, а таксама ў Жодзіне, Віцебску, Чашніках, Наваполацку, Гродне, Лідзе, Гомелі, Калінкавічах, Магілёве і Брэсце. Падкрэсліваецца і неабходнасць працягу ўзаемадзеяння паміж дзяжурнымі службамі міліцыі, сацыяльна-педагагічнымі цэнтрамі і агульнанацыянальнай дзіцячай лініяй дапамогі па арганізацыі сумеснага рэагавання на званкі дзяцей. Дарэчы, сёння грамадскае аб'яднанне «Разуменне» займаецца пошукам мясцовых донараў для фінансавання работы лініі. Пазней плануецца перавесці дзіцячую лінію з доўгага нумара 8 801 100 16 11 на кароткі, трох- або чатырохзначны.

Сярод іншых актуальных задач — прыцягненне міжнародных рэсурсаў для Цэнтра садзейнічання пошуку зніклых і эксплуатаваных дзяцей, прызнанне на дзяржаўным узроўні праблемы гвалту ў інтэрнатах і прытулках і г.д. Варта адразу дадаць пазітыўныя тэндэнцыі апошняга часу ў вырашэнні праблемы сіроцтва. Як адзначае **начальнік аддзела сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Маргарыта МАТВЕЕНКА**, за апошнія дзесяць гадоў колькасць дзяцей-сірот зменшылася з 35 да 21 тысячы. З дапамогай інтэрнэт-партала www.dadomu.by, які змяшчае звесткі пра 4100 дзяцей з прававым статусам для ўсынаўлення, летась удалося размясціць 1090 чалавек, з іх 193 вярнуліся да біялагічных бацькоў. За 5 апошніх гадоў было закрыта 18 і рэарганізавана 9 інтэрнатаў для сірот (колькасць устаноў скарацілася з 54 у 2011-м да 36 у 2015-м).

Шэраг краін свету, у тым ліку і наша, сёння будуюць такую сістэму абароны дзяцей, якая будзе адэкватна рэагаваць на сучасныя выклікі. Да такіх выклікаў можна аднесці глабальную віртуалізацыю, што, на думку псіхолагаў, пацягне новы «прадукт» гвалту. Як высвятляецца, межы паміж светам віртуальным і рэальным у дзяцей могуць сцірацца. Практыка сведчыць, што нават паняцці смерці «там» і «тут» для некаторых дзяцей становяцца размытымі.

Вопытам пераадолення праблемы гвалту ў дачыненні да дзяцей падзялілася **доктар псіхалогіі, прафесар Барбара БОНЕР**, якая доўгі час узначальвала Міжнароднае таварыства па папярэджванні гвалту над дзецьмі і Амерыканскае таварыства абароны дзяцей ад гвалту. На канферэнцыі яна, у прыватнасці, паведаміла аб тым, што ў яе краіне падлеткі да 18 гадоў складаюць каля 30 працэнтаў вінаватых у сексуальным гвалце над дзецьмі. Акрамя таго, устаноўлена, што прыкладна трэцяя частка дзяцей, якія перажылі гвалт, самі схільныя ў далейшым да гвалтоўных паводзін. Адсюль і асаблівая ўвага да прафілактыкі гвалту як сярод тых, хто сам перажыў падобнае, так і сярод гвалтаўнікоў. Апошніх пачынаюць вучыць па спецыяльных навуковых праграмах правільным сексуальным паводзінам, ім тлумачаць пра іх уласную адказнасць, прапануюць напісаць пісьмо-прабачэнне пацярпеламу дзіцяці і яго бацькам... Калі гвалт у дачыненні да іншага дзіцяці ўчыніў падлетак, суд накіроўвае яго на 100 гадзін грамадскіх работ (напрыклад, на прыборку прытулку для жывёл). Словам, да рознага ўзросту і полу — свае падыходы. Статыстыка сведчыць, што за апошнія 15 гадоў у ЗША ўзровень сексуальнага гвалту над дзецьмі істотна знізіўся.

«Усе людзі па сваёй прыродзе пазітыўныя, а негатыўнае яны робяць таму, што нечага не ведаюць або не ўмеюць, — заўважыў у сваім выступленні **дэкан факультэта прафесійнага развіцця спецыялістаў адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар псіхалагічных навук, прафесар Уладзімір ЯНЧУК.** — Гвалтаўнікі не атрымліваюць па нейкіх прычынах тое, што ім неабходна. Што менавіта — яны і самі, як правіла, не ўсведамляюць. Нехта можа проста не адчуваць сваёй запатрабаванасці ў грамадстве. Задача грамадства пры гэтым — фарміраваць культуру ненасілля, якую будзе падзяляць як мага большая колькасць людзей. Дзецям неабходна даваць веды і вучыць імі карыстацца. Кожнаму дзіцяці павінны патлумачыць, што такое павага іншага чалавека, што ў адзіночку не выжыць, што патрэбен дыялог. А дыялог — гэта права іншага быць іншым».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

### Толькі статыстыка

**▸ 1807 дзяцей сталі ахвярамі злачынства супраць палавой недатыкальнасці і палавой свабоды ў 2009—2015 гадах.**

**▸ У нас расследуецца каля 15 працэнтаў ад агульнай колькасці злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці і палавой свабоды непаўналетніх.**

**▸ У дзіцячага гвалту вельмі шмат «твараў»: гэта цялесныя пашкоджанні, удары далонню, выспяткі, драпіны, апёкі, удушэнне, грубае хапанне, штурханне, пляўкі, прымяненне папругі і г.д.; выхаванне, пры якім парушаюцца правы дзіцяці, няўвага да яго патрэб у ежы, адзенні, жыллі, медаглядзе; абвінавачанні, прыніжэнне поспехаў, годнасці, працяглае пазбаўленне любові, пяшчоты, клопату і бяспекі, прымушэнне да адзіноты, гвалт у прысутнасці дзіцяці ў дачыненні да іншых дзяцей ці дарослых, выкраданне дзіцяці, прычыненне болю свойскай жывёле з мэтай запалохаць дзіця.**

### Навошта патрэбны дружалюбныя пакоі?

**Апытанне дзяцей, якія сталі ахвярамі і сведкамі гвалтоўных злачынстваў, можа стаць паўторнай псіхалагічнай траўмай — дзіцяці давядзецца зноў прыгадваць і аднаўляць перажытае. Гэтага можна пазбегнуць, калі праводзіць апытанне ў дружалюбных умовах, спецыяльных пакоях.**

**Тут размову вядуць псіхолагі. Пакой аснашчаны відэакамерай і адчувальным мікрафонам. Следчы кіруе «працэсам» з суседняга пакоя. Ён перадае неабходныя пытанні псіхолагу з дапамогай спецыяльнага абсталявання. Псіхолаг строіць дыялог з дзіцем з улікам яго ўзросту, на аснове поўнага даверу. Апытанне праводзіцца адзін раз. Запіс размовы захоўваецца на дыску, які перадаецца следчаму. Такім чынам удаецца захаваць псіхіку дзіцяці і павысіць якасць паказанняў.**

# СВЕТ ТОЛЬКІ ВЫЙГРАЕ АД АДЗІНСТВА

**Праблема наркотыкаў датычыцца кожнай краіны і ўсіх слаёў насельніцтва. Пра гэта ў Нью-Ёрку на спецыяльнай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, прысвечанай праблеме наркотыкаў, заявіў намеснік Генеральнага сакратара ААН Ян Эліясан. Спецыяльная сесія Генасамблеі дазваляе скаардынаваць калектыўныя намаганні міжнароднай супольнасці па вырашэнні агульнай праблемы.**

Не сакрэт, што наркагандаль падсілкоўвае гвалт і карупцыю, падрывае закон і парадак. Выручка ад продажу наркотыкаў нярэдка выкарыстоўваецца для спансіравання тэрарызму і экстрэмізму. Эліясан нагадаў, што палітыка ў гэтай галіне адбіваецца і на правах чалавека. Некаторыя людзі не жадаюць звяртацца па дапамогу, таму што баяцца пакарання або прымусовага лячэння. Злоўжыванне наркотыкамі забівае і калечыць мільёны людзей, прыводзіць да распаўсюджвання СНІДу, туберкулёзу і гепатытаў. Такім чынам, папярэджванне і лячэнне наркаманіі патрабуе падыходу, заснаванага на павазе правоў чалавека, павінна адпавядаць індывідуальным патрэбам пацыентаў.

— Зусім нядаўна, седзячы ў перапоўненай зале пасяджэнняў аддзялення ААН у Вене, я стаў сведкам таго, як краіны да глыбокай ночы напружана ўзгаднялі выніковы дакумент па наркапалітыцы, — кажа **выканаўчы дырэктар упраўлення ААН па наркотыках і злачыннасці Юрый ФЯДОТАЎ.** — Цяпер гэты дакумент прадстаўлены на спецсесіі. Да нарады ў Вене ў сусветных сталіцах быў праведзены шэраг мерапрыемстваў з удзелам вучоных, даследчыкаў, прадстаўнікоў розных арганізацый і грамадскай супольнасці. З улікам адрозненняў у гісторыі, культуры і традыцыях, дасягненне згоды для розных краін па падобных дакументах — няпростая задача. Аднак Арганізацыя Аб'яднаных Нацый заўсёды імкнулася да згоды і адзінства. Гэта неабходна. Бо ў свеце налічваецца каля 27 млн чалавек, якія пакутуюць ад нарказалежнасці, пры гэтым 12 млн спажываюць наркотыкі ін'екцыйным шляхам. Сур'ёзную праблему для ўсяго свету ўяўляе опійная індустрыя Афганістана. А яшчэ — з'яўленне новых смяротна небяспечных псіхаактыўных рэчываў, навадненне Паўночнай Амерыкі танным гераінам, рост спажывання какаіну ў Заходняй і Усходняй Афрыцы. Ад разгулу гвалту, звязанага з наркотыкамі, пакутуе насельніцтва Цэнтральнай Амерыкі... Выніковы дакумент, падрыхтаваны ў выніку шматмесячных перамоў на высокім узроўні, уяўляе сабой найбольш удалую спробу знайсці рашэнне гэтых вострых праблем...

У дакуменце, у прыватнасці, падкрэсліваецца, што міжнародныя канвенцыі аб кантролі над наркотыкамі забяспечваюць гнуткасць для паспяховага вырашэння праблем, звязаных з наркаманіяй. Гэта азначае пошук альтэрнатыў пазбаўленню волі за дробныя правапарушэнні, звязаныя з захаваннем наркотыкаў, і даступнасць наркатычных рэчываў для медыцынскіх мэт. Не менш важнае значэнне надаецца і пытанням умацавання здароўя, у тым ліку мерам барацьбы з ВІЧ.

«Выніковы дакумент, прадстаўлены днямі ў Нью-Ёрку, абвяшчае неабходнасць сумеснага вырашэння глабальнай праблемы, — падкрэслівае Юрый Фядотаў. — Свет ад такога адзінства толькі выйграе».

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*




## НЕ ШКАДУЙ, ЗГУБІЎШЫ...

...Чатыры гады таму мая хрэсніца ўдваіх з жаніхом прыязджалі запрашаць мяне на вяселле. Я, вядома, паабяцала быць і ці не ў той жа вечар пачала рыхтавацца. Па-першае, маладыя вырашылі сэканоміць і таму папрасілі мяне «патамадзіць» (значыць, мне трэба было распрацаваць сцэнарый), па-другое, «пасада» вядучай патрабавала адпаведнага знешняга выгляду (сукенкі, прычоскі...) ды безлічы розных прызоў для конкурсаў, па-трэцяе, мне патрэбны былі самы прыгожы каравай і букет. А нарэшце...

Хрэсніца як бы між іншым сказала, што бацькі жаніха даўно ў разводзе і маці замужам за іншым, а вось бацька... І прыгожы ён, маўляў, і вясёлы, і разумны, і добры, а жыве адзін. Я — таксама... Дык раптам?.. Ну сапраўды: чым чорт не жартуе, пакуль Бог спіць? Надзея ж памірае апошняй.

І вось наступае дзень вяселля. Я на машыне (усё падрыхтавана і прадумана) выязджаю з горада. Па дарозе ў кветкавай краме забіраю букет, кладу яго на задняе сядзенне, перш чым сесці за руль, ляпаю боцікамі, каб абтрэсці снег; заводжу машыну. Радуюся, што ўсё пакуль ладзіцца, што я паспяваю, што хвілін праз трыццаць (дарога добрая) буду ў мястэчку, убачу сваю радню, абдыму маладых...

Усё, карацей, цудоўна! Але... было, пакуль, заехаўшы ў двор, я не ступіла на зямлю, пакуль, адчуўшы, што нешта не так, не глянула на ногі і, у прыватнасці, на правы бот... без абцаса, які, трэба разумець, я... «абтрэсла» — разам са снегам...

Разгубленасць, крыўда, адчай — гэта, вядома ж, не ўсе пачуцці, якія зваліліся на мяне ў той момант. А выйсце толькі адно — абувацца ў туфлі і ў іх, па снезе, ісці «кіраваць парадам»...

З чаго ён пачынаўся і як праходзіў, тут расказваць не буду. Скажу хіба, што вяселле атрымалася на славу! А гэта ж надзейная прыкмета — якое вяселле, такое ў маладых і жыццё.

Такім чынам дамоў я вярталася, можна сказаць, шчаслівая.

Засмучала хіба адно: боты. Нідзе ж не дзенешся, давядзецца лезці на антрэсолі, даставаць адтуль старыя, ісці ў іх на працу. А гэтыя, новыя — несці ў майстэрню, думаць там пра замену абцасаў... Наўрад ці ўдасца нешта годнае падабраць... Да таго ж я і так у даўгах — у што гэта выльецца? Вось каб абцас нейкім чынам знайшоўся...

З гэтымі міжвольнымі думкамі я ўязджала ў горад. Уязджала, вядома ж, па той самай дарозе, што і выязджала. А таму без ніякіх надзей «крутнулася» да кветкавай крамы.

Выйшла там з машыны, стала на «беразе» велікаватай лужыны (на дварэ пацяплела, снег растаў). І (ці паверыце!)... убачыла свой абцас! Ён ляжаў ля бардзюра ў невялічкай шчылінцы, і, здавалася, усміхаўся мне! А ўжо я яму, — нібы роднаму!

...Вы, магчыма, спытаеце, хто яго потым прыбіў?

Адкажу: бацька маладога, і ў... той жа вечар.

На вяселлі яшчэ, падчас танцаў, мы з ім разгаварыліся. Тады ж высветлілася, што першы раз ён убачыў мяне, калі я, толькі прыехаўшы, ішла ў хату, і шчыра пашкадаваў: маўляў, жанчына сапраўды прыгожая, але ж кульгавая (тое, што адзін бот без абцаса, ён не заўважыў)...

Другі раз (ужо седзячы за сталом) ён запаважаў мяне, бо, «нягледзячы на гэтую фізічную загану», (ну ці ж не малайчына?!), я не мела нейкіх там комплексаў.

На трэці (на «танцпляцоўцы») — ён заўважыў, што кульгавасць у мяне досыць дзіўная — непрыкметная ў вальсе.

На чацвёрты — што яе чамусьці... няма, але ж была — дакладна... Дзе тады дзелася?

Карацей, усё пачалося менавіта з абцаса! Гэта ён, згублены, дапамог мне спачатку прыцягнуць увагу найлепшага ў свеце мужчыны, потым — цягам вечара — пастаянна падтрымліваць яе, а нарэшце — заваяваць... І не толькі сімпатыю.

Вы скажаце: неверагодна! Але так бывае: праз год у майго мужа нарадзіліся першы ўнук і... першая дачка.

**Л. Паповіч,**
*г. Мінск*

## ВАДА, ЯК ТОЙ ГОСЦЬ...

Паводка для беларускага Палесся — з'ява звычайная.

І ў той жа час — не зусім... У 1958-м, памятаю, проста пазалівала вёскі, у 1979-м — пазалівала настолькі, што ў многія хаты можна было заплываць на лодках. Затым была вясна 1999-га, і жыхары яшчэ загадзя сталі рыхтавацца да разводдзя. Бульбу з капцоў пераносілі на гарышчы ці на больш высокія месцы; для жывёлы ў хлявах рабілі так званыя рошты; каб каровы не стаялі ў вадзе, не чапалі, не выкідвалі гною з хлявоў...

Вядома ж, рыхтавалася да паводкі і мясцовая ўлада: распрацоўвала так званы план мерапрыемстваў па мінімізацыі наступстваў, прызначала адказных за кожны населены пункт.

...Добра памятаю, як сам я прыехаў у вёску Запясочча.

— Ты чаго гэта да нас, Мікітавіч? — пытаецца дзед Піліп.

— Ды вось, — кажу, — сіноптыкі прагназуюць паводку. Прыехаў расказаць, што рабіць.

— Гэта добра, — прызнаў дзед Піліп. — Твая вёска вясной заўсёды плавае. Дык ты, можа, і сапраўды нешта слушнае падкажаш. А то летась прыехаў чыноўнік, які гэтай паводкі ў вочы не бачыў, але ж таксама нас павучаў... А навошта? Мы ж і самі ўсё ведаем, загадзя рыхтуемся, бо вада — як той госць, яна прыйшла і пайшла...

Але добра, што пры гэтым пазмывала бруд, падсілкавала зямлю...

І гусям раскоша. У пойменных вёсках іх цэлыя чароды былі: усё лета гусі пасвіліся на паплавах, а восенню іх прыганялі дадому. Амаль дармавое мяса.

Я быў рады, што вяскоўцы падрыхтаваныя да разводдзя. Заставалася зазірнуць у краму, нагадаць, каб завезлі ў запас прадуктаў...

Паводка ў той год і сапраўды была памятнай. На шчасце, вялікай шкоды яна не прынесла. Дзед Піліп меў рацыю: вада, як той госць...

**Васіль Пяшэвіч,**
*в. Юр'евічы,*
*Жыткавіцкі раён.*

## РАЗВОД,

### альбо Пра тое, адкуль... рогі растуць і як іх збіваюць

Вы ведаеце, што рог — гэта цвёрды выраст на галаве некаторых жывёл. Ведаеце, што ён — звычайна парны, што можа быць музычным інструментам, а таксама — пасудзінай (напрыклад для віна). Ведаеце, што іх, гэтыя рогі, жонкі могуць настаўляць асобным мужам і могуць насіць самі.

Не верыце? Тады слухайце.

Са сваёй першай я пражыў аж 10 гадоў. Чаму аж? Бо дагэтуль дзіўлюся: як вытрымаў?!

Сам я багаценькім Бурацінам не быў, спадчыны ад заможных сваякоў не атрымліваў (мая палавіна, зрэшты, таксама). Але ж пры гэтым я працаваў, як чорны вол, а яна лічыла сябе паненкай. І — адпаведна — жыцця патрабавала акурат такога ж: бесклапотнага, панскага. Прычым патрабавала не толькі ад мяне, нават ад дзяцей. Яны змалку ведалі, што іх маме дужа цяжка, што яна — пакутніца, што яе трэба шанаваць і шкадаваць. А вось бацька — гэта абібок, які з ранку да вечара недзе швэндаецца і нічога не робіць...

Не вынес я гэтакіх адносін, падумаў: не ўсё ж кату масленіца, хай будзе і вялікі пост. Ну сапраўды, хай пажыве мая гаротніца так, як хоча: хай паспіць да абеду (ложак з новага гарнітура тады палову спальні займаў), хай сама паездзіць (напярэдадні машыну купіў) на танцы жывата (бо ў апошнія гады папаўнела), хай папрымае ў сябе сапраўдных мужчын, ад якіх (кожны дзень мне казала!) у яе адбою няма і г.д.

Карацей, у адзін добры момант сабраў я неабходныя рэчы, прыхапіў ласіныя рогі, знойдзеныя дзедам у лесе, і сышоў: пасяліўся ў бацькоўскай хатцы непадалёк.

Як і варта было чакаць, пасля гэтага для дзяцей (з падачы жонкі) я стаў амаль што ворагам: бачыцца са мной катэгарычна не дазвалялася.

Але ж — чаго не вольна, таго і карціць — шасцігадовы сын употай ад маці ўсё часцей прыбягаў да мяне ў госці.

У адзін з такіх візітаў ён і звярнуў увагу на рогі: папытаўся, чые?

Трэба было мне праўду сказаць, але ж... Дужа крыўдаваў я на былую жонку! Душа балела... А таму з горкай іроніяй ляпнуў, што рогі, маўляў, маміны, што яна апошнім часам нават рэшткі сумлення страціла — вось рогі ў яе і выраслі.

Малы мой трохі памаўчаў (падобна, абдумваў пачутае), а потым пацікавіўся:

— А як яны раслі?

Што было рабіць? Прыладзіў я рогі да ўласнага лба, сказаў:

— Прыкладна так.

Вочы ў сына акругліся ад здзіўлення і захаплення, а следам пачаўся сапраўдны допыт. Кшталту: «А як гэтыя рогі трымаліся?», «А як мама з імі ўваходзіла ў дзверы?», «А як спала?» І ўрэшце: «А як ты іх зняў?»

Адступаць не было куды: Астапа, што называецца, несла далей. Я — а дакладней крыўда мая — пачаў казаць, што мама ўсіх і ва ўсім папракала, пехам хадзіць не любіла (каб толькі яе вазілі), рабіць нічога не хацела, ела хіба прысмакі... «А калі чалавек так жыве, — казаў я малому, — то ў яго з'яўляюцца рогі і паступова пачынаюць расці: становяцца большыя, потым яшчэ большыя... Імі за ўсіх чапляюцца, імі з усімі бадаюцца... Вось таму я неяк не вытрымаў: як даў нагой ды па тых рагах!.. Збіў іх і забраў з сабою — на памяць».

Малы, як і варта было чакаць, паверыў. У яго дзіцячых вачах адбіўся вобраз таты-героя.

Праўда, на дзень-другі. Потым сын зноў завітаў да мяне і папрасіў:

— Тата, а пакажы яшчэ раз, як у мамы рогі раслі, бо яна сказала, што іх не было.

І зноў нейкі нячысцік прымусіў мяне прыставіць рогі да лба, прайсціся з імі па хаце.

Дзіцяці, як відаць, гэта спадабалася. Ва ўсякім разе потым, варта было жонцы хоць нечым пакрыўдзіць, сынок тут жа бег да мяне, але не скардзіўся, а прасіў паказаць, як рогі раслі і як я збіваў...

Гэта, ну згадзіцеся, была неверагодная гісторыя! І яе, вось такую, першакласнік не мог трымаць у сабе. А таму пра маё геройства хутка даведалася настаўніца. Гладзячы малога па галове, яна тлумачыла, што тата пажартаваў.

...Прайшлі гады. Мой сын, можна сказаць, вырас, але ж калі-нікалі, гледзячы на рогі (ужо, дарэчы, адпаліраваныя і пакрытыя лакам), ён усміхаецца і просіць:

— Тата, а ў мяне вось такія пакуль не прабіваюцца?.. Ты ж глядзі, калі пачнуць расці, збівай іх маленькімі, бо потым балюча будзе.

Што праўда, згадзіцеся, тое праўда.

**Генадзь Р.**
*г. Магілёў*

**P.S.** ***У пошце рубрыкі «Алё, народ на провадзе!» ёсць не толькі вясёлыя і праўдзівыя гісторыі. Усё часцей там гучыць: «Які провад? Амаль няма ўжо падобнай сувязі... Адсталі вы ад жыцця!»***

***І сапраўды, народ у нас прасунуты: інтэрнэт, планшэты, смартфоны, электронная пошта (усё менш гісторый з канвертаў)... Дык, можа, і сапраўды, варта перайменаваць рубрыку, назваць яе...***

***Як?***

***Меркаванні на гэты конт у рэдакцыі ёсць, але ж рубрыка — ужо пятнаццаць гадоў! — чытацкая, ваша. Значыць, вам, чытачам, і карты ў рукі. Ці не так?***

***Чакаем прапаноў.***

***І новых гісторый — таксама.***

**Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | | |
| **Продавец** | **Минское районное потребительское общество, г. Минск, ул. Бровки, 24** | | |
| **Предмет аукциона** | | | |
| **Наименование** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **Лот № 1** | | | |
| **Магазин №39** | 137,7 кв.м | 600/С-139782 | Минский р-н, Роговский с/с, д. Головачи, 2А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,2038 га** предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 18.09.2032 для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 99 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 2** | | | |
| **Здание магазина** | 71,1 кв.м | 600/С-150281 | Минский р-н, г. Заславль, ул. Приморская, 1А |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0156 га предоставлен на праве аренды сроком по 06.08.2042 для обслуживания здания магазина с установленными ограничениями (водоохран. зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 179 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 3** | | | |
| **Склад** | 20,4 кв.м | 600/С-150472 | Минский р-н, г. Заславль, ул. Набережная, 2Б |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0,0099 га предоставлен на праве аренды сроком по 19.03.2018 для обслуживания здания склада с установленными ограничениями (водоохран. зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 139 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот № 4** | | | |
| **Сарай** | 14,2 кв.м | 600/С-150471 | Минский р-н, г. Заславль, ул. Набережная, 2В |
| **Сведения о земельном участке**: пл. 0.0062 га предоставлен на праве аренды сроком по 19.03.2018 для обслуживания здания сарая с установленными ограничениями (водоохран. зона водных объектов) | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 98 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с 3012343260010; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | |
| Извещение о проведении предыдущих аукционов опубликовано **в газете «Звязда» от 26.03.2016.** | | | |
| **Аукцион состоится 06.05.2016** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 05.05.2016** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by**. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

Начальная стоимость имущества ООО «Сеньор сыр» – здание детского сада, публикация о торгах которого осуществлена в газете «Звязда» № 69 от 14.04.2016 г., **составляет 183 822 230 рублей без НДС.** УНП 191228804

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

**25 мая 2016 года в 11.00**

**в здании Щучинского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11,**

**состоится аукцион по продаже права на предоставление поверхностного водного объекта – пруда возле деревни Пески,**

**расположенного на территории Щучинского района Гродненской области, в аренду для рыбоводства**

Поверхностный водный объект расположен в Щучинском районе Гродненской области у деревни Пески, площадью 7,79 га. Тип пруда русловой. Поверхностный водный объект является проточным. Заполнение происходит за счет установленной дамбы на мелиоративном канале, талых вод и атмосферных осадков. Водосбор пруда равнинный, котловина изрезанная, прямоугольная, вытянутая с изгибом, в средней части преобладают глубины 1,5 м, максимальная глубина у водосброса около 3,2 м, мелководные зоны занимают около 40 процентов.

**Начальная цена объекта торгов – 354 500 (триста пятьдесят четыре тысячи пятьсот) рублей.**

Задаток вносится в размере 20 процентов от начальной цены объекта торгов с подачей в комиссию заявления и составляет 70 900 (семьдесят тысяч девятьсот) рублей.

Принять участие в аукционе могут юридические лица и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели.

Для участия в аукционе, **в срок по 23 мая 2016 года до 16.00**, необходимо предоставить комиссии по организации и проведению аукциона по адресу: Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11, кабинет 65, следующие документы:

- заявление на участие в аукционе с указанием сведений о поверхностном водном объекте, котором участники торгов желают получить в аренду по результатам торгов;

*- заверенную банком копию платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Гродненской области № 3600527000010 в ЦБУ 424 филиала № 400 Гродненское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Щучин, код 752, УНП 500563252, назначение платежа 4004;*

- юридическим лицом – копии учредительных документов и копию свидетельства о государственной регистрации юридического лица;

- физическим лицом – копию паспорта гражданина или иного документа, удостоверяющего личность;

- индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя;

- доверенность представителя участника торгов и копию документа, подтверждающего его личность (в случае, если заявление подписывается не участником торгов).

Затраты на организацию и проведение торгов (за публикацию извещения о проводимых торгах в средствах массовой информации) составили 1 938 000 (один миллион девятьсот тридцать восемь тысяч) рублей и подлежат возмещению участником торгов, выигравшим торги, *на расчетный счет Щучинского районного исполнительного комитета 3604527000016 в ЦБУ 424 филиала № 400 Гродненское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Щучин, код 752, УНП 500066573, ОКПО 04063954, в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.*

Заверенная банком копия платежного поручения, квитанции или иного документа, подтверждающего внесение суммы возмещения затрат, предоставляется в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11, кабинет 65.

Срок заключения по результатам торгов договора аренды поверхностного водного объекта для рыбоводства – 5 лет.

Адрес и номер контактного телефона секретаря комиссии: **Гродненская область, Щучинский район, город Щучин, площадь Свободы, 11, кабинет 65. тел.: (01514) 2 95 86; 2 83 38.**



■ Людзі і лёсы

# СЕМ ГАЛІНАК МІМОЗЫ

ВЯСНА...

Якой бы яна ні выдалася — ранняй альбо позняй, сонечнай ці шэрай, — першыя сакавіцкія дні, якраз тыя, калі надыходзіць жаночае свята, заўсёды асаблівыя. У крамах і на рынку тоўпяцца пераважна мужчыны, вуліцы вялікіх і малых гарадоў маладзеюць кветкамі. Яны паўсюль — на капотах машын і вынесеных століках кавярняў, у вітрынах і на касах крам, а галоўнае — у руках хлопчыкаў, падлеткаў, мужчын, якія, хто беражліва, хто няўмела, а хто з гонарам нясуць іх сваім мамам, жонкам, каханым, сёстрам...

Увесь гэты святочны гарадскі гармідар Аліна ўспрымала з прымессю гаркоты, бо кветак ёй даўно ніхто не дарыў. Але прайсці міма іх жанчына не магла. З усёй шматколернасці яе погляд прыцягвалі найперш мімозы. Гледзячы на іх, заўсёды ўяўляліся жоўценькія кураняткі, якія толькі-толькі вылупіліся з яек — кволыя, пяшчотныя, бездапаможныя. Хацелася прыхінуць іх да твару, сагрэць дыханнем, прынесці дамоў з тым, каб такі вось вясновы цуд асвятліў, ажывіў і яе маленькую кватэру, яе жыццё.

Аліна падышла да легкавіка з мноствам раскладзеных на капоце галінак, выбрала адну, але самую бухматую і, аддаючы прадаўцу грошы, не стрымала эмоцый.

— Як сумна, — сказала ці то сабе, ці то яму, — што прыходзіцца самой купляць сабе кветкі.

— Не проста сумна, а недаравальна, каб такой прыгожай жанчыне ды іх не дарылі! — прамовіў немалады інтэлігентны мужчына, затрымаўшы яе за локаць і зірнуўшы ў поўныя маркоты вочы. — Але ж гэта лёгка паправіць!

Адну за другой ён выбіраў галінкі:

— Калі ласка, прыміце ў знак свята.

Аліна, нібы дзяўчынка, залілася чырванню, але букет (вось дык сюрпрыз!) узяла. Больш за тое — дазволіла незнаёмцу правесці яе дадому. «Каб ніхто не паквапіўся на такі раскошны букет і яго ўладальніцу», — пажартаваў той.

Яны ішлі па вуліцы поруч, і тонкі пах мімозы крыху кружыў галаву. З боку Аліны гэта было, відаць, безразважна, але ж нельга не аддзячыць чалавеку за кветкі, нельга не запрасіць яго на кубачак кавы?

За тым кубачкам-другім яны разгаварыліся. Павел расказаў, што ў іх гарадок пераехаў нядаўна. Да гэтага жыў у сталіцы і лічыў, што мае ўсё — сям'ю, кватэру, прэстыжную працу... Але шчасце аказалася ўяўным. Жонка, як высветлілася, даўно кахала іншага і не пакідала сям'і толькі з-за матэрыяльных даброт; сын, ажаніўшыся, зусім аддаліўся, дом стаў халодным і пустым, так што вяртацца ў яго па вечарах не хацелася. А потым з-за сямейных перажыванняў чужым стаў горад, у які ён некалі гэтак рваўся, нямілай справа, якой займаўся, і ўсё атачэнне таксама.

А ўрэшце ён зразумеў, што трэба нешта мяняць, і апынуўся тут. Як тое старое дрэва на новым месцы, цяжка прыжываўся. Каб «уцячы» ад думак, многа працаваў: распачаў, а потым і разгарнуў сваю справу. Так што ў матэрыяльным плане ён зноў падняўся на ногі. А вось запоўніць душэўную пустату пакуль не мог.

Гісторыя Аліны была прасцейшая, але не менш сумная. З той розніцай хіба, што яе душэўныя раны час даўно загаіў... Але ж пры гэтым ён не вылечыў ад пакутлівай адзіноты, якая асабліва даймала ў святы.

З ТОЙ выпадковай сустрэчы Аліна і Павел сталі бачыцца, сустракацца: бліжэй знаёміліся, адно аднаму раскрывалі сэрцы, знаходзілі шмат агульнага. А праз год пабраліся шлюбам, Павел перавёз яе ў сваю кватэру, якую набыў у іх гарадку яшчэ да знаёмства. І ўсё ў іх стала выдатна!..

Азмрочвала хіба адно — госці, а дакладней госць. Сын Паўла наведваўся да іх даволі часта, і кожны яго візіт прыносіў крыўды. Алік упарта не прызнаваў бацькавай абранніцы і адкрыта дэманстраваў сваю непрыязнасць. Магчыма, ён не губляў надзеі, што бацька памірыцца з маці, якая так і не выйшла замуж? Як магчыма і тое, што ён проста баяўся застацца без пастаяннай бацькавай падтрымкі, асцерагаўся, што ўсім нажытым дабром будзе распараджацца чужая жанчына.

Зрэшты, многага з іх узаемаадносін Павел не ведаў: Аліна ўтойвала свае крыўды, не нагаворвала яму на сына. Яна, наадварот, старалася, каб паміж імі ва ўсім было паразуменне, бо гэта ж самыя родныя людзі. Да таго ж ёй самой не пашчасціла мець дзяцей, і яна ўсім сэрцам гатова была прыняць Аліка як свайго.

Той адгарадзіўся пагардай.

Такім чынам, лыжка дзёгцю ўсё ж была. Але як мала яна значыла ў параўнанні з той «бочкай» шчасця, якое Аліне даваў Павел! Часам ёй нават не верылася, што ў саюза дваіх ужо немаладых людзей можа быць столькі цеплыні і пяшчоты, столькі клопату і радасці, веры і надзеі...

АЛЕ ўсё — і дрэннае, і добрае — некалі канчаецца: іх шчасце абарвала бяда. І грымнула яна як гром сярод яснага неба: Павел без нічога ніякага стаў кволіцца, звярнуўся ў паліклініку, атрымаў накіраванне на аналізы. Убачыўшы іх, медыкі тэрмінова адправілі мужчыну ў анкалагічны дыспансер. І там, пасля дэталёвага абследавання, прагучаў прысуд: анкалогія... Чацвёртая стадыя... Неаперабельны.

Для Аліны гэта быў шок.

А Павел трымаўся, трымаўся да апошняга. Магчыма, ён верыў у цуд, а хутчэй за ўсё, проста шкадаваў жонку, бо ведаў, што ёй яшчэ плакаць і плакаць — потым, без яго.

...Хавала мужа яна адна. Сын, Алік адпачываў тады за мяжой, і Аліна нават не ведала, як з ім звязацца.

Праз некалькі дзён пасля пахавання, разбіраючы дакументы, яна ўбачыла завяшчанне. Кватэру і машыну муж пакідаў ёй. «Паўлічак, родны, навошта мне ўсё без цябе? — плакала ўдава. — Хай сыну»...

ЯНА вярнулася ў сваю маленькую аднапакаёўку і ў сваю адзіноту. Хоць, зрэшты, не: Павел нябачна прысутнічаў там — жыў у светлых, сонечных успамінах, у снах, у песнях, якія зусім нядаўна слухалі разам, у кнігах, што чыталі па чарзе. Пяць гадоў, якія падарыў Павел, значылі для Аліны больш, чым усё ранейшае жыццё.

Пяць гадоў — ад вясны да вясны.

...Яна, першая вясна без яго, пачыналася, як усе — са свята: напярэдадні 8-га Сакавіка іх гарадок зноў расквечваўся цюльпанамі, мімозамі, ружамі... і несці гора ў гэтай атмасферы ўсеагульнай святочнасці было невыносна цяжка! Аліна нават сотавы свой адключыла, бо як прымаць віншаванні, калі душа заходзіцца ад болю?..

Яна ўключыла ціхую музыку, што запаўняла іх з Паўлам дом, і скруцілася на канапе.

Сплаканая, знямоглая, не адразу пачула званок у дзверы... Потым не хацела ўставаць і адчыняць іх, але ўрэшце ўсё ж падышла. На парозе з букетам мімоз стаяў Алік — сын Паўла.

— Прабачце мне ўсё, калі зможаце, — ціха прамовіў ён, уручаючы кветкі. — Я ведаю, што на 8-га Сакавіка тата вам заўсёды дарыў мімозы. Дык няхай яны будуць у вас і сёння...

Аліна прыняла кветкі, схавала твар у духмяных галінках, і кволы праменьчык радасці крануў яе сэрца.

**Фаіна КАСАТКІНА.**

*г. Паставы*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи, ул. Тельмана, 100** |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, д. 99:**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Здание контрольно-технического пункта** | Здание специализированное иного назначения | 132,9 | 110/C-79292 |
| **Здание центральной диспетчерской службы** | Здание специализированное иного назначения | 41,6 | 110/C-79236 |
| **Здание мастерских № 1** | Здание специализированное иного назначения | 802,3 | 110/C-81176 |
| **Административное здание** | Здание административно-хозяйственное | 120,5 | 110/C-79181 |
| **Здание мастерских № 3** | Здание специализированное иного назначения | 415,6 | 110/C-81189 |
| **Здание склада запчастей** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 314,7 | 110/C-79249 |
| **Здание мастерских № 2** | Здание специализированное иного назначения | 831,2 | 110/C-81157 |
| **Здание бытового корпуса** | Здание специализированное иного назначения | 309,1 | 110/C-81197 |

| | |
|---|---|
